Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

24 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. АЎТОРАК №205 (28569)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Як «атамку» правяралі на надзвычайную сітуацыю

СТАР. 4



## Утульны дамок для кажана

СТАР. 9



## Права называць сябе

СТАР. 13

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Адыход ад перакрыжаванага субсідавання будзе ажыццяўляцца паэтапна — па меры росту заробкаў і пенсій. Ліквідацыя перакрыжаванага субсідавання дазволіць знізіць фінансавую нагрузку на рэальны сектар эканомікі, паменшыць сабекошт выпускаемай прадукцыі, павысіць яе канкурэнтаздольнасць. Хачу яшчэ раз прывесці агульнавядомы факт. ААТ «МАЗ» плаціць зараз 11,3 цэнта за 1 кВт·гадз. электраэнергіі, КамАЗ — 4,5 цэнта, МАЗ плаціць $268 за 1 тысячу куб. м газу, а КамАЗ — $65. Таму пытанне стаіць у тым, што трэба шукаць спосабы, каб выраўняць умовы. Калі будзе ліквідавана перакрыжаванае субсідаванне, то можна будзе, напрыклад, знізіць нагрузку на прадпрыемства адразу на 4,5 цэнта за 1кВт·гадз. Аднак зрабіць гэта імгненна нерэальна».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.10.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9539 ▼ |
| Еўра | 2,2959 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0340 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0734 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# УЧОРА – ЛІСЦЕ, ЗАЎТРА – СНЕГ?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Шклоўскія школьнікі Валянцін ГАЛІНОЎСКІ і Уладзіслаў ЯНЧАНКА ў гарадскім парку.

■ Нагода задумацца

## РАЗМЫТЫЯ КРЫТЭРЫІ «САЦЫЯЛЬНАЙ НЕБЯСПЕКІ»

### Калі дзіця прыходзіць у школу непадрыхтаванае, гэта неабавязкова азначае, што дома ў яго няма ўмоў рабіць урокі

**Усе да аднаго дзеці, якія аказаліся ў сацыяльна небяспечным становішчы, павінны быць своечасова выяўлены, колькі б гадоў ім ні было. Чым раней будзе вызначана праблема, тым хутчэй будзе арганізавана работа з сям'ёй, пакуль сітуацыя не дайшла да прызнання дзіцяці маючым патрэбу ў дзяржаўнай абароне і не скончылася пазбаўленнем дарослых бацькоўскіх правоў. Але само азначэнне «сацыяльна небяспечнае становішча» першапачаткова няўдалае, а крытэрыі, згодна з якім дзеці лічацца тымі, хто трапіў у гэтае становішча, вельмі размытыя. Так лічыць Зінаіда ВАРАБ'ЁВА, загадчык сектара сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама.**

— Тэрмін «сацыяльна небяспечнае становішча» адразу насцярожвае і не спрыяе атрыманню сям'ёй прапануемай дапамогі, робіць сям'ю не такой, як звычайныя, ператтварае яе членаў у не зусім самастойных людзей, тых, хто не мае права без згоды, напрыклад, органа апекі і папячыцельства распараджацца сваёй уласнасцю. Лепш было бназваць дзіця з такой сям'і асобай, якая трапіла ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, — разважае спецыяліст. — З гэтай назвы ўжо робіцца зусім іншая высноа — што малому неабходна дапамога. Тым больш што самі крытэрыі аднясення да сацыяльна небяспечнага становішча досыць размытыя. Адзін з іх — знаходжанне дзяцей у экстрэмальнай жыццёвай сітуацыі, да якой адносіцца і канфліктная сітуацыя ў сям'і. У многіх выпадках яе цяжка вызначыць.

Сапраўды, адна справа, калі бацькі паміж сабой лаюцца ды п'юць, і зусім іншая, калі ў кватэры пражываюць дзве сям'і, у якіх ёсць дзеці. Скажам, дарослыя брат і сястра або зусім чужыя людзі, якія вымушаны жыць у адным памяшканні. Пры гэтым яны не могуць дамовіцца паміж сабой па-людску і ўвесь час высвятляюць адносіны з удзелам міліцыі і судоў.

СТАР. 5

## У АКЦЯБРСКАЙ АДСВЯТКУЮЦЬ ДВА ЮБІЛЕІ

**Напярэдадні сотай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў аграрным гарадку Акцябрская Віцебскага раёна.**




Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

Тут актыўна рыхтуюцца адсвяткаваць не толькі юбілей рэвалюцыі. Ёсць для вяскоўцаў, бадай, больш важная гістарычная падзея: 45 гадоў таму ганаровае званне «Імя 50-й гадавіны СССР» прысвоілі саўгасу «Салюты». Дзякуючы яму і развівалася Акцябрская. І так цудоўна ўсё прадумалі, што праект забудовы атрымаў залаты медаль і дыплом 1-й ступені на конкурсе Усесаюзнай выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі! А потым пабудаванае адзначылі прэміяй урада БССР. Старажылы памятаюць візіты сюды Машэрава і Гарбачова, іншых вядомых усім людзей. Калісьці тут былі фантан і нават кінастудыя. Вышэйшы пілатаж гульні паказвалі хакейная і валейбольная каманды.

### Эксперыментавалі шмат

З абласнога цэнтра сюды можна даехаць на рэйсавым аўтобусе. Таму тутэйшыя жартуюць, што яны сельскія гарадскія. І, безумоўна, з часам аграгарадок можа стаць часткай горада. У Віцебску, дарэчы, ёсць Кастрычніцкі раён.

СТАР. 5

# ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ЯК ГАЛОЎНЫ ПАКАЗЧЫК

## Прэзідэнту далажылі пра ход уборачнай і восеньскай пасяўной кампаній

**Праблемы развіцця аграпрамысловага комплексу, а ў прыватнасці — меры па завяршэнні ўборачных работ, карэкціроўку структуры пасяўных плошчаў у Віцебскай вобласці, удасканаленне спецыялізацыі аграрнай вытворчасці ў названым рэгіёне абмеркавалі ўчора ў Палацы Незалежнасці. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу, прысвечаную сельскагаспадарчай тэматыцы.**



Фота БЕЛТА.

— Справа не толькі ў вытворчасці, але і ў канкрэтным жыцці людзей. Гэта значыць, у сацыяльным аспекце, — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Нягледзячы на тое, што асноўная «бітва за ўраджай» ужо найпоўшая гісторыя — збожжавыя культуры даўно і паспяхова сабраныя, казаць пра заканчэнне ўборачнай не прыходзіцца. Усё яшчэ ідзе ўборка бульбы, буракоў, іншых сельскагаспадарчых культур, важных для харчовай бяспекі краіны.

Не дзіўна, што ў першую чаргу Прэзідэнт пацікавіўся ходам уборачнай:

— Што засталося сабраць? Час не цярпіць, пара заканчваць. Наколькі я інфармаваны, з бульбай праблем няма — калі вы мяне дакладна інфармуеце. Буракі па плане ўбіраюцца, асаблівай тут насцярожанасці быць не павінна. Але вось уборка кукурузы на сілас — час, скажам мякка, прыспешвае.

Пажаданне Прэзідэнта — да 7 лістапада скончыць уборку названых культур.

— Застанецца ў вас трохі кукурузы на зерне — а можа, і паспееце сабраць; і трохі буракоў. Будучы ўраджай — гэта пад'ём зябліва. Араць трэба кожны дзень, пакуль тут работа арганізавана дрэнна. Але калі зноў жа верыць статыстыцы, палова пераараная, як ні дзіўна, у Віцебскай вобласці. Але, відаць, так і павінна быць, таму што вясной у Віцебскім рэгіёне, як народ кажа, у поле не ўлезці без ботаў. Таму, каб не абуваць боты, трэба падрыхтаваць глебу пад пасеў яравых культур ужо сёння.

Віцебшчыны датычыцца і асобнае, як назваў яго Прэзідэнт — прыватнае, але вельмі важнае для краіны — пытанне. Сітуацыя з сельскай гаспадаркай там абмяркоўвалася не раз падчас уборачнай кампаніі.

— Нам трэба пайсці на сур'ёзную рэформу аграпрамысловага комплексу Віцебшчыны, — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. — І мы дамовіліся, пачынаць будзем са структуры пасяўных плошчаў. Нам трэба кардынальна змяніць падыход да вядзення сельскай гаспадаркі на Віцебшчыне. У наступным годзе мы павінны гэту праблему вырашыць раз і назаўсёды.

Асабліва, па словах Прэзідэнта, гэта датычыцца структуры пасяўных плошчаў з арыентацыяй і на структуру сельскагаспадарчай вытворчасці. Як растлумачыў кіраўнік краіны, гэта значыць, трэба вызначыцца, што мы будзем там вырабляць, улічваючы кліматычныя ўмовы Віцебскай вобласці, а таксама ўраджайнасць зямлі ў рэгіёна, узровень земляробства, так і вядзення сельскай гаспадаркі.

— Вось комплекс пытанняў, якія я хацеў бы абмеркаваць, — абагульніў кіраўнік краіны. — Але хацеў бы вас папярэдзіць: ніякага ашуканства, калі не ведаеце, не кажыце. Вы ж не паправіце сітуацыю дакладамі па валавой вытворчасці таго ці іншага прадукту або паказчыка. Галоўнае — гэта грошы. Ёсць грошы — нармальна працуе. Рэнтабельная вытворчасць — малайцы. Калі гэтага няма, тады навошта расказваць, якія ў вас там прывагі, якая таварнасць малака і гэтак далей? Гэта важна для таго, каб аператыўна кіраваць вытворчасцю, але гэта не мая функцыя — аператыўна кіраваць. Гэта функцыя павінна заканчвацца на ўзроўні губернатара і вам паступаць для даведкі — ну і мне, калі вы мяне інфармуеце. Галоўны паказчык — эфектыўнасць. Вось, што галоўнае, а тут — не прыпішаш.

Падчас рабочай сустрэчы кіраўнік дзяржавы нагадаў аб сваёй ранейшай просьбе да кіраўніка Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніда Зайца ўзяць на кантроль адно-два полі — дапусцім, у Віцебскай вобласці — і паглядзець, якія будуць усходы, як увойдуць пасевы ў зімоўку і што будзе вясной.

— Каб ужо нарэшце вызначыцца з гэтымі «аптымальнымі тэрмінамі пасеваў», — аргументаваў Прэзідэнт.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

### У тэму

**Леанід ЗАЯЦ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

— Цукровыя буракі мы плануем сабраць валавым зборам 4,6 млн тон, што на 325 тысяч тон больш за ўзровень мінулага года. Бульбу мы завяршаем капаць на працягу двух дзён — з валавым зборам у адзін мільён шэсцьдзясят тысяч тон. Гэтага дастаткова для таго, каб забяспечыць унутранае спажыванне і сфарміраваць каля 500 тысяч тон экспартнага патэнцыялу. Акрамя гэтага, у полі яшчэ 60 тысяч гектараў кукурузы на зерне — чаканы ўраджай — 500 тысяч тон. Усяго намалоцім больш за адзін мільён тон.

## ■ Грамадзянская супольнасць

# ІМ ДА ЎСЯГО СЯГОННЯ СПРАВА ЁСЦЬ

### Якія пытанні абмяркоўваюцца на мерапрыемствах «Белай Русі» ў рэгіёнах перад з'ездам?

**Напярэдадні чарговага з'езда Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», што павінен прайсці ў наступным месяцы, абласныя арганізацыі збіраюць круглыя сталы, праводзяць сустрэчы, канферэнцыі, на якіх закранаюцца самыя розныя тэмы — пачынаючы ад унутранага ладу краіны да яе міжнароднай палітыкі. Мы звярнуліся да кіраўніцтва абласных арганізацый грамадскага аб'яднання, каб высветліць, якія аспекты абмяркоўваюцца найбольш сур'ёзна, а якія ў перспектыве могуць быць паднятыя на будучым з'ездзе.**

**Намеснік старшыні Брэсцкай абласной арганізацыі Васіль ЛАШЧ:**

— Галоўныя пытанні — гэта адносіны з Расіяй, Еўрасаюзам, а таксама аспект тэрарызму. Акрамя таго, мы актыўна абмяркоўваем сацыяльную палітыку дзяржавы, праблему сацыяльнага ўтрыманства. Магчымасць працаўладкавання моладзі па спецыяльнасці і атрыманне годнай заработнай платы — гэта моманты, якія цікавяць усіх, не толькі членаў «Белай Русі». Беларусь — высокаадукаваная інтэлектуальная краіна, і ў гэтай сувязі нас хвалюе адток моладзі з высокімі баламі атэстатаў, якія паступаюць у ВНУ Расіі, Літвы, Польшчы, дзе іх прымаюць без цэнтралізаванага тэсціравання. У гэтай сувязі гучалі прапановы вызначыць бал атэстата, які б дазваляў не праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне або праходзіць яго толькі па профільным прадмеце. Ведама, найважнейшай тэмай нашых сустрэч на абласным узроўні стала развіццё «Белай Русі» як грамадска-палітычнай арганізацыі і яе роля ў кансалідацыі беларускага грамадства.

**Намеснік старшыні Гродзенскай абласной арганізацыі Святлана ВАРАНІЦА:**

— Найбольш «папулярныя» моманты ў нас — гэта стварэнне сістэмы падбору і выхавання кадраў. Сур'ёзнае абмеркаванне выклікала пытанне аб формах дзейнасці маладзёжнага парламента. У ходзе правядзення раённых і абласной канферэнцый было вызначана, што трэба зрабіць акцэнт на ўзмацненні ролі пярвічных арганізацый, актывізацыі іх дзейнасці ў залежнасці ад прыналежнасці да галін. Мы лічым, што найважнейшая задача абласной арганізацыі — гэта далейшае ажыццяўленне яе кансалідуючай ролі па рэалізацыі праграмных рашэнняў дзяржавы. Сур'ёзнай задачай нашай арганізацыі з'яўляецца забеспячэнне актыўнага ўдзелу яе членаў у будучых выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў. Дарэчы, як заснавальнік «Белай Русі» Гродзенская абласная арганізацыя лічыць, што ў цэлым аб'яднанне гатова і можа быць пераўтворана ў палітычную партыю.

**Намеснік старшыні Магілёўскай абласной арганізацыі Барыс ЗІНКЕВІЧ:**

— Па выніках круглых сталоў на падставе тых аспектаў, якія цікавяць нашых членаў больш за ўсё, мы распрацавалі рэкамендацыі ў праект праграмы арганізацыі. Так, сумесна з БРСМ, Беларускім саветам ветэранаў, Фондам міру мы прапануем прымаць актыўны ўдзел у павышэнні матывацыі да самаразвіцця і працоўнай дзейнасці навучэнцаў і рабочай моладзі. Асаблівая ўвага павінна ўдзяляцца патрыятычнаму выхаванню, фарміраванню грамадзянскай жыццёвай пазіцыі і павышэнню ўзроўню інтэлектуалізацыі падрастаючага пакалення. Акрамя таго, праз маладзёжны парламент пры Саветах дэпутатаў трэба ствараць умовы для рэальнага ўдзелу маладых грамадзян у рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі, фарміраванні прававой і палітычнай культуры грамадзян. Выкарыстоўваючы банк даных для лідараў моладзі, членаў «Белай Русі» і выпускнікоў вышэйшых навучальных установаў варта прыцягваць у грамадска значныя палітычныя працэсы, дапамагаць хутчэй адаптавацца ў працоўным калектыве. З лепшых можна фарміраваць кадравы рэзерв, рэкамендаваць для вучобы ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце і вылучаць на кіруючую работу.

**Намеснік старшыні Гомельскай абласной арганізацыі Наталля МАМРУКОВА:**

— Падчас справаздачна-выбарнай канферэнцыі нашай абласной арганізацыі было ўнесена некалькі цікавых прапаноў, якія выклікалі актыўнае абмеркаванне: так, член аналітычнай групы пры Рэспубліканскім Савеце Андрэй Стэльмах падзяліўся сваімі думкамі аб рабоце з моладдзю. Ён прапанаваў прапрацаваць пытанне аб арганізацыі аналітычных клубаў на базе пяршасных ячэек, у якія будуць уваходзіць 10—15 маладых спецыялістаў розных спецыяльнасцяў і структурных аддзелаў прадпрыемстваў. Ён таксама дадаў, што на базе клубаў можна арганізаваць круглыя сталы для абмеркавання актуальных праблем развіцця саміх прадпрыемстваў або арганізацый, устаноў адукацыі, горада, рэгіёна, праблем моладзі. Адно з «папулярных» пытанняў — гэта кадравы патэнцыял. Неабходна, каб тут на чале арганізацыі стаялі не проста аўтарытэтныя людзі, а кіраўнікі пэўных раённых структур, якія маюць перспектывы росту.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

**Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку аддзела па падрыхтоўцы законапраектаў і ўзаемадзеянні з Пастаяннай камісіяй Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Броннікаву Андрэю Сяргеевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## ЗША могуць прывесці ядзерныя бамбардзіроўшчыкі B-52 у кругласутачную боегатоўнасць

ВПС ЗША чакаюць загаду прывесці ядзерныя бамбардзіроўшчыкі B-52 у кругласутачную боегатоўнасць упершыню з часоў халоднай вайны. Пра гэта піша Defence One са спасылкай на генерала Дэвіда Гольфейна. Як ён растлумачыў, увядзенне кругласутачнай боегатоўнасці для ядзерных бамбардзіроўшчыкаў стала б адной з мноства мер, якія прымаюць ЗША, рэагуючы на змяненне геапалітычнай абстаноўкі. «Свет — небяспечнае месца, і ў нас ёсць тыя, хто адкрыта кажа пра выкарыстанне ядзернай зброі. Гэта ўжо не біпалярны свет, дзе гэта толькі мы і Савецкі Саюз. Існуюць іншыя гульцы, якія валодаюць ядзерным патэнцыялам», — падкрэсліў генерал.

## Іена абвалілася па выніках выбараў у Японіі

Японская іена прадказальна адрэагавала рэзкім падзеннем — да ліпеньскіх мінімумаў (114 за долар) — на навіну пра тое, што партыя прэм'ер-міністра Сіндза Абэ атрымала ўпэўненую перамогу на выбарах, якія адбыліся ў мінулыя выхадныя. Пры гэтым акцыі японскіх кампаній рэзка выраслі. Прэм'ер умацаваў свае пазіцыі і, хутчэй за ўсё, цяпер застанецца ва ўладзе па меншай меры да 2021 года. У Абэ будзе дастаткова часу для рэалізацыі планаў па змене пацыфісцкай канстытуцыі Японіі. Чакаецца таксама, што будзе захавана ўльтрамяккая палітыка, якую апошнім часам праводзіць Банк Японіі для стымулявання эканомікі і інфляцыі.

## Жыхары італьянскіх Венета і Ламбардыі прагаласавалі за аўтаномію ад цэнтральных улад

У галасаванні ў Венета ўдзельнічалі 59,7% выбаршчыкаў. У выніку каля 98% чалавек выказаліся за пашырэнне паўнамоцтваў рэгіянальных улад. У Ламбардыі пераважная большасць (95%) жыхароў таксама выступілі за аўтаномію вобласці ад цэнтральнага ўрада. Яўка ў рэгіёне склала больш за 40%. Рэферэндумы ў Венета і Ламбардыі носяць кансультацыйны характар, і іх вынікі не дазволяць імгненна змяніць статус абласцей. Аднак, як адзначае ТАСС, цяпер кіраўнікі рэгіёнаў атрымліваюць народны мандат на пачатак перамоў з урадам, як прадугледжана канстытуцыяй Італіі. Ламбардыя і Венета, дзе пражывае чвэрць насельніцтва Італіі, разам фарміруюць трэць эканомікі краіны.

## Легенда грузінскага футбола Каха Каладзэ стане мэрам Тбілісі



Кандыдат ад кіруючай партыі «Грузінская мара», экс-капітан зборнай Грузіі па футболе 39-гадовы Каха Каладзэ перамог на выбарах мэра Тбілісі, набраўшы 51,06% галасоў выбаршчыкаў. Такія звесткі агучыла Цэнтральная выбарчая камісія Грузіі. Як адзначае DW, на мясцовых выбарах амаль усюды перамаглі прадстаўнікі «Грузінскай мары» — за выключэннем Кутаісі, дзе верагодны другі тур. У Тбілісі Каладзэ ўпэўнена абышоў сапернікаў. Выбары ў органы мясцовага самакіравання ў ЦВК Грузіі ўжо назвалі «свабоднымі і справядлівымі». Каладзэ ў 1995—1997 гадах выступаў за тбіліскае «Дынама», затым за кіеўскае «Дынама», а пасля гэтага на 10 гадоў з'ехаў у Італію і гуляў за «Мілан». Двойчы ў складзе «Мілана» станавіўся пераможцам Лігі чэмпіёнаў, пяць разоў яго прызнавалі лепшым гульцом Грузіі.

# ГУЧНЕЙ НА ЎВЕСЬ СВЕТ!

**Удзельнікі XIX Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў ад нашай краіны вярнуліся з Сочы. Яны паспелі атрымаць асалоду ад атмасферы мерапрыемства, паўдзельнічаць у міжнародных дэбатах на тэмы, якія хвалююць увесь свет, прайсці праз вялікую колькасць сяброўскіх спартыўных спаборніцтваў. Але таксама яны змаглі паказаць усім сваю краіну, яе дасягненні ў сферах эканомікі, маладзёжнай палітыкі і высокіх тэхналогій. Варта таксама адзначыць, што асаблівае месца на беларускай выставе было нададзена прэзентацыі Еўрагульняў-2019, якія адбудуцца ў Мінску.**



Фота БЕЛТА.

Кіраўнік дэлегацыі **міністр адукацыі** Ігар **КАРПЕНКА** звярнуў увагу журналістаў яшчэ і на тое, што прадстаўнікі БРСМ падчас фестывалю правялі адкрыты дыялог на тэму «Моладзь за мір і добрасуседства». Гэты форум наведалі прадстаўнікі многіх замежных дэлегацый. У ходзе размовы ўсе ўдзельнікі выказалі сваю заклапочанасць вялікай колькасцю ўзброеных канфліктаў ва ўсім свеце. «Усе маладыя людзі сышліся ў меркаванні, што перамоўная пляцоўка для новага Хельсінкскага працэсу сапраўды патрэбна для таго, каб абмеркаваць пытанні мірнага суіснавання паміж краінамі, іх перспектыўнага ўзаемадзеяння», — адзначыў Ігар Карпенка. Акрамя таго, па словах міністра адукацыі, удзельнікі з беларускага боку праяўлялі вялікую актыўнасць на многіх пляцоўках фестывалю. Таксама былі праведзены шэраг двухбаковых сустрэч і перамовы з кіраўніцтвам профільных міністэрстваў Кубы, Індыі, Калінінградскай вобласці Расіі. «Трэба падзякаваць нашым дэлегатам — яны добра падрыхтаваліся да мерапрыемства», — рэзюмаваў Ігар Карпенка.

Беларуская выстава вiдавочна адрознівалася па сваіх памерах і размаху ад многіх іншых экспанентаў мерапрыемства. Яе афармленне ў нацыянальным стылі сапраўды прыцягвала погляды тысяч людзей. Усе госці змаглі даведацца тут аб нацыянальных беларускіх традыцыях, дасягненнях краіны ў адукацыі, аб яе турыстычным патэнцыяле.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

## Клуб «залатыя рукі»

# З ПРЫЦЭЛАМ... НА КАЗАНЬ

**У Абу-Дабі завяршыўся 44-ы чэмпіянат WorldSkills International — самы прэстыжны ў свеце конкурс прафесійнага майстэрства.**

Спаборніцтвы праводзяцца кожныя два гады ў міжнародным фармаце. Прыняць удзел у чэмпіянаце «залатых рук» могуць маладыя кваліфікаваныя рабочыя, студэнты, навучэнцы ліцэяў і каледжаў ва ўзросце да 22 гадоў, але толькі адзін раз у сваім жыцці.

У 44-м чэмпіянаце, які праходзіў у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, удзельнічалі 1300 канкурсантаў з 59 краін, якія дэманстравалі прафесійнае майстэрства ў 52 кампетэнцыях. За імі назіралі 1,5 тысячы экспертаў. Конкурс наведала больш за 125 тысяч чалавек — і гэта новы рэкорд! Чэмпіянат у Абу-Дабі стаў самым масавым па колькасці наведвальнікаў...

Для беларусаў гэта была толькі другая спроба выступлення на самым высокім міжнародным узроўні. Да руху WorldSkils, які ахоплівае ўжо 76 краін і амаль 70 працэнтаў насельніцтва нашай планеты, мы далучыліся толькі ў 2014 годзе. У агульнакамандным рэйтынгу, у якім былі адзначаны 57 краін-удзельніц, наша краіна заняла 16-е месца.

Беларускія хлопцы і дзяўчаты выступалі ў 27 кампетэнцыях: «абліцовачныя работы», «выраб мэблі», «зварачныя работы», «сухое будаўніцтва», «вэб-дызайн», «цяслярскія работы», «праграмнае забеспячэнне для бізнесу», «такарныя работы», «фрэзерныя работы», «электроніка», «дызайн адзення» і іншых.



Надзея КАШЦЯЛЯН выконвае конкурснае заданне.

**Медаль выдатніка ў намінацыі «цырульніцкае мастацтва» заваявала выпускніца Брэсцкага дзяржаўнага каледжа сферы абслугоўвання Надзея КАШЦЯЛЯН.**

Дзяўчына працуе ў адной з брэсцкіх цырульняў, пастаянна ўдзельнічае ў міжнародных спаборніцтвах. Напрыклад, яна выдатна выступіла ў Нацыянальным чэмпіянаце «Маладыя прафесіяналы» (WorldSkills Расія — 2017), у адкрытым чэмпіянаце прафесійнага майстэрства ў Кітаі, дзе таксама выйграла медаль выдатніка.

Трэба зазначыць, што сёлета патрабаванні да ўдзельнікаў спаборніцтваў істотна ўзраслі: каб заваяваць медаль выдатніка, неабходна было набраць у асабістым заліку 700 балаў, тады як у Бразіліі ў 2015-м — толькі 500. Большасць удзельнікаў беларускай каманды атрымалі звыш 650 балаў, прычым аднаму з іх да пераможнага медаля не хапіла ўсяго трох балаў.

Нашу краіну таксама прадстаўлялі ў Абу-Дабі 27 трэнераў-экспертаў, якія напярэдадні атрымалі міжнародныя сертыфікаты. Наяўнасць такога сертыфіката дае ім магчымасць уносіць свае прапановы пры распрацоўцы праграм будучых міжнародных спаборніцтваў прафесійнага майстэрства.

Але трэба заўважыць, што World Skills — не проста спаборніцтвы. Іх фармат выкарыстоўваецца для таго, каб дапамагчы краінам павысіць якасць і ўзровень прафесійных кампетэнцый моладзі, прадукцыйнасць працы і, ў выніку, забяспечыць эканамічны рост. Увогуле, прафесійныя стандарты WorldSkills — гэта стандарты заўтрашняга дня. Вяртаючыся ў свае навучальныя ўстановы, на вытворчасць, у свае кампаніі, маладыя людзі прывозяць туды апошнюю інфармацыю аб тым, як можна ўдасканальваць прафесійнае майстэрства. Усё гэта дае ім шанцы на добрае працаўладкаванне і хуткі кар'ерны рост.

Наступны 45-ы конкурс World Skills пройдзе ў 2019 годзе ў Расійскай Федэрацыі, у Казані. Між іншым, Расія заняла ў Абу-Дабі 5-е месца ў агульнакамандным заліку.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Здарэнні

# Скінуў сабаку з пятага паверха

**У сталіцы праваахоўнікі затрымалі мужчыну, які з агульнага балкона пятага паверха дома па вуліцы Ясеніна скінуў сабаку.**

Грамадзянін 1988 года нараджэння, які раней ужо быў судзімы за рабаванне, на добрым падпітку прыйшоў да сяброўкі. Тут ён вывеў яе сабаку на лесвічную пляцоўку і пачаў падымаць жывёлу на руках над галавой, а потым кідаць на падлогу. Калі на пляцоўку выйшла суседка і паспрабавала абараніць сабаку, мужчына кінуўся да яе, але жанчына паспела схавацца ў сваёй кватэры. Затым зламыснік аднёс жывёлу на агульны балкон і скінуў уніз. У гэты час каля пад'езда сядзела жанчына, якая бачыла, як сабака ляцеў з вышыні. Жывёла загінула на месцы. Мужчына быў затрыманы, заведзена крымінальная справа за хуліганства, па факце праводзіцца праверка.

# Парнастудыя... у кватэры

**Супрацоўнікі сталічнага наркакантролю падчас правядзення аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў па выяўленні асоб, якія займаюцца распаўсюджваннем парнаграфіі ў інтэрнэце, затрымалі беспрацоўнага 32-гадовага ўраджэнца Бабруйска, які па месцы жыхарства ў Мінску арганізаваў парнастудыю.**

У ёй ён ажыццяўляў фота- і відэазапісы парнаграфічнага характару з удзелам асоб мужчынскага полу з лютага мінулага года па кастрычнік бягучага. Аператыўнікі канфіскавалі фотаапараты з парнаматэрыяламі, фалаімітатары, назапашвальныя SD-карткі і абсталяванне для фота- і відэаздымак. Устаноўлена, што знятыя парнаграфічныя матэрыялы мужчына перасылаў за мяжу для распаўсюджвання на сайтах, за што атрымліваў грашовыя пераводы. Грамадзяніну за яго дзейнасць можа пагражаць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да чатырох гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Надвор'е

# ХОЛАДНА, А Ў ЧАЦВЕР — ПЕРШЫ СНЕГ

**Няўстойлівае надвор'е з дажджом і мокрым снегам чакаецца ў Беларусі на гэтым тыдні, паведамляюць спецыялісты з Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды**



У сераду ўначы будзе без ападкаў, удзень у заходніх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымыя слабы туман і галалёд. Удзень па захадзе чакаецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 6 градусаў да плюс 1, а па ўсходзе — да мінус 8 градусаў. Максімальная тэмпература ўдзень прагназуецца ад плюс 1 да плюс 7 градусаў.

У чацвер на большай частцы тэрыторыі краіны чакаецца моцны мокры снег, які будзе пераходзіць у дождж. Уначы і раніцай магчымы слабы галалёд. А дыскамфорту надвор'ю дадасць моцны і парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы будзе знаходзіцца ў межах ад мінус 5 градусаў па паўночным усходзе да плюс 6 градусаў па паўднёвым захадзе. Удзень будзе ад плюс 2 да плюс 8 градусаў, а па паўднёвым захадзе тэмпература павысіцца да 9—12 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пятніцу захаваецца няўстойлівае надвор'е. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, уначы і раніцай па паўночным усходзе магчымыя мокры снег і слабы галалёд. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе 3—9 цяпла, а ўначы ў паўночна-ўсходніх раёнах будзе каля нуля.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Наўздагон

# НАПЕЎ ЗЯМЛІ МАЁЙ

**Чатырнаццаты раз горад Мар'іна Горка прымаў удзельнікаў і гасцей абласнога фестывалю народнай творчасці «Напеў зямлі маёй».**

Мерапрыемства, якое ўпершыню стартавала ў Пухавіцкім раёне ў 2001 годзе і атрымала тут пастаянную прапіску, лічыцца галоўным форумам аматарскай творчасці Мінскай вобласці і ахоплівае ўсю жанравую палітру народнага мастацтва. У межах фестывалю адбылася творчая імпрэза «Песняры беларускага слова», прысвечаная 135-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, урачыстасці з нагоды святкавання Дня работнікаў культуры, канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя І. Жыновіча, конкурс «На хвалях творчасці».

У конкурснай праграме ўзялі ўдзел 23 аматарскія калектывы народнай творчасці з усіх рэгіёнаў Міншчыны, для якіх фестываль з'яўляецца своеасаблівым экзаменам, вынікам творчай дзейнасці. Кожны з іх прадэманстраваў свае талент і прафесіяналізм. Выступленні ацэньвала журы на чале з кампазітарам Ігарам Лучанком. У складзе яго і такія аўтарытэтныя асобы, як мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору імя Г. Цітовіча Міхаіл Дрынеўскі.

Гран-пры фестывалю — мікрааўтобус — дастаўся Смалявіцкаму раёну, які прадставілі народны ансамбль «Пліса» Акцябрскага сельскага дома культуры, узорны духавы аркестр і народны вакальны ансамбль «Ад шчырага сэрца» дзіцячай школы мастацтваў.

Не засталіся без узнагарод і іншыя пераможцы і ўдзельнікі конкурсу. Ім уручаны камплекты гукаўзмацняльнай апаратуры, камп'ютары, мікрафоны.

Дадам, «Напеў зямлі маёй» — галоўная культурная падзея ў жыцці вобласці. Гэтаму форуму народных талентаў удзяляецца асаблівая ўвага з боку Мінаблвыканкама.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

Днямі **беларускі пісьменнік, ветэран Вялікай Айчыннай вайны**, вялікі сябар нашай газеты **Іван МУРАВЕЙКА** адзначыў свой 96-ы дзень нараджэння. «Звязда» шчыра віншуе Івана Андрэевіча, зычыць яму моцнага здароўя, новых творчых ідэй і бадзёрага настрою!



Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# БЕЛАЭС ПАД КАНТРОЛЕМ

## МАСАВЫЯ ВУЧЭННІ МНС ПРАЙШЛІ НА АСТРАВЕЧЧЫНЕ

**МАГАТЭ выстаўляе шмат патрабаванняў да атамных электрастанцый, якія будуюцца. Сярод іх — серыя вучэнняў па рэагаванні на радыяцыйныя аварыі, якія ставяць за мэту праверку сістэмы гатоўнасці аператыўнага рэагавання. Яны праходзілі сёлета на Астравеччыне 18—19 кастрычніка. У вучэннях узялі ўдзел карэспандэнты «Звязды».**




Іх легенда ўключала самае неймавернае, што толькі можа здарыцца, — на энергаблоку адбылася цяжкая аварыя: корпус рэактара быў разбураны, а ў навакольнае асяроддзе пачала выдзяляцца радыяцыя. Практычнай адпрацоўкай задумы займаліся падраздзяленні МНС, Мінабароны, МУС, міністэрстваў аховы здароўя і энергетыкі Беларусі і Расіі.

Старту актыўнай фазы вучэнняў папярэднічала дэманстрацыя пажарнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі і абсталявання, якія ўжо паступілі на ўзбраенне Астравецкага раённага падраздзялення МНС. Гэта і пажарныя цыстэрны аб'ёмам 10, 8 і 5 тон, і перасоўны вытворча-тэхнічны цэнтр, на базе якога можна экстранна адрамантаваць аўтамабіль, і спецыяльная машына, абсталяваная лесвіцай вышынёй у 48 метраў, і пажарна-помпавая станцыя, якая можа гнаць ваду на адлегласць да двух кіламетраў.

— Звярніце ўвагу на аўтамабіль хімічнай радыяцыйнай разведкі, — кажа **інжынер хімічнай і радыяцыйнай абароны Віталь НЕСЦЯРОВІЧ.** — Пырскаабаронча касцюмы прызначаны для працы з агрэсіўнымі рэчывамі. Яны выкарыстоўваюцца сумесна з фільтравальнымі каробкамі і індывідуальнымі дазіметрамі. Тут у нас ёсць і электрагенератар на два кілаваты, спецыяльныя шчыльныя боты, набор ёмістасцяў для адбору проб зямлі, паветра, вады, а таксама апараты на сціснутым паветры для работы ў непрыдатным для дыхання асяроддзі. Метэастанцыя вызначае тэмпературу, вільготнасць, хуткасць і кірунак паветра. Між іншым, кожны касцюм важыць каля 13 кілаграмаў! А вось і дазіметр з наборам блокаў дэтэктавання на ўсе віды радыеактыўнага выпраменьвання. Ёсць і спектрометр, створаны для вызначэння радыенуклідаў з вялікай убудаванай базай і GPS-навігатарам, які можа даць канкрэтны пункт іх знаходжання. І ўсё гэта зроблена ў Беларусі.

Адначасова на самой БелАЭС працавала спецыяльная камісія па надзвычайных сітуацыях. Супрацоўнікі станцыі адпрацоўвалі алгарытмы ліквідацыі здарэння ў спецыяльным вучэбна-трэніровачным цэнтры. Між іншым, у ім створаны абсалютны дубль сапраўднага пульта кіравання. І гэта не кажучы пра такую ж тэмпературу паветра і матэрыял, з якога пабудаваны сцены.

Непасрэдна актыўная фаза вучэнняў пачалася з эвакуацыі жыхароў у радыусе трох кіламетраў ад АЭС. Цэнтр падзей перамясціўся ў вёску Бабраўнікі, дзе цяпер каля 80 жыхароў.

— Для адпрацоўкі эвакуацыі мы выкарыстоўвалі статыстаў, але яшчэ да старту вучэнняў ратавальнікі прыйшлі да кожнага жыхара трохкіламетровай зоны і расказалі пра патрэбны алгарытм дзеянняў, — зазначыў **афіцыйны прадстаўнік МНС Віталь НАВІЦКІ.**



На выездзе з вёскі запрацаваў зборны эвакуацыйны пункт. Жыхароў Бабраўнікаў апавяшчалі сігналамі грамадзянскай абароны, трансляцыяй гукавой інфармацыі. Дапамагалі ў гэтым аўтамабілі ДАІ, на якіх ёсць адмысловыя ўстаноўкі. Старшыня сельсавета, які выконваў абавязкі начальніка пункта, фарміраваў групы для адпраўкі. Людзі атрымалі сродкі абароны, ёдную прафілактыку і накіраваліся ў аўтобусы для дастаўкі ў пункт часовага размяшчэння ў астравецкай гімназіі №1.

На межах «чыстай» і «бруднай» зон размясціўся адмысловы кантрольна-размеркавальны пункт. Рух транспарту і насельніцтва быў арганізаваны па двух калідорах — чырвоным (з павышаным радыяцыйным фонам) і зялёным (нармальным). Насельніцтва і транспарт рэгістраваліся на ўваходзе ў пункт. Акрамя таго, было разгорнута месца спецыяльнай апрацоўкі тэхнікі вадой і растворам, якія падаваліся ад пажарных аўтацыстэрнаў. Пасля апрацавання машыны зноў праганялі праз дазіметрычны кантроль. Калі фон не нармалізаваўся, працэдура паўтаралася, або аўтамабілі адпраўлялі на чырвоны калідор.

А ратавальнікі МНС і валанцёры Чырвонага Крыжа ў палатках арганізавалі два пункты — медыцынскі прыёмна-сартавальны і частковай санітарнай апрацоўкі.

Фінальным этапам вучэнняў стала работа пункта часовага размяшчэння насельніцтва. Ён можа змясціць да 200 чалавек і мусіць быць прыведзены ў гатоўнасць усяго за 4 гадзіны. Перасоўная радыеметрычная лабараторыя Дзяржпамежкамітэта вызначала індывідуальную дозу апраменьвання. Кожны чалавек атрымліваў памятку са схемай і пропуск. У медпункце прыём вялі ўрач і псіхатэрапеўт Астравецкай раённай бальніцы. У сталовай было арганізавана трохразовае харчаванне, а таксама працавала інтэрнэт-кавярня з wi-fi для сувязі з роднымі і блізкімі.



А ў спартыўнай зале былі падрыхтаваны спальныя месцы і арганізавана дапамога псіхолагаў МНС, Чырвонага Крыжа і ўрачоў бальніцы раёна.

— І МНС, і ўсе іншыя ведамствы прадэманстравалі поўную гатоўнасць да развіцця любых магчымых нештатных сітуацый, — адзначыў па выніках вучэння **намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА.** — Назіральнікі і ўдзельнікі вучэнняў адзначылі іх высокі ўзровень. Тым больш што мы вельмі актыўна і сур'ёзна рыхтуемся да запуску станцыі. Хачу нагадаць, што першы энергаблок будзе запушчаны ўжо праз два гады, а ў 2020-м запрацуе і другі блок. Вучэнні паказалі, што да гэтага мы гатовы па ўсіх кірунках працы. Усе спецыялісты — і выпускнікі беларускіх навучальных устаноў, і тыя, хто ўжо мае досвед работы на атамных электрастанцыях, — гатовы да дзеянняў у самых разнастайных сітуацыях.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Зваротная сувязь

# Дакрануцца да «дыямента»

## Пераможцы віктарыны «Мая Скарыніяна» наведалі Нацыянальную бібліятэку

**Як і абяцалі, абвяшчаючы ўмовы «звяздоўскай» віктарыны, прымеркаванай да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, пераможцы гэтага інтэлектуальнага спаборніцтва трапілі ў Нацыянальную бібліятэку на адмысловую бясплатную экскурсію. Віктарыну «Звязда» праводзіла сумесна з галоўнай кніжнай скарбніцай краіны (пытанні ад Нацыянальнай бібліятэкі ва ўсіх трох турах былі самымі складанымі, бо, у адрозненне ад астатніх, не мелі варыянтаў адказаў).**

На экскурсію ў гэту суботу прыехалі чытачы «Звязды» з розных рэгіёнаў краіны. З вуснаў нашага экскурсавода Вольгі Дарожкі скарыназнаўцы-аматары даведаліся шмат цікавага пра тое, як будавалася бібліятэка, якія яна ўладкаваная, чаму ўласна ў «дыяменце» няма чытачоў (там знаходзіцца кнігасховішча, але да самога «дыямента» можна літаральна дакрануцца, стоячы на адмысловым шкляным мосце), як адтуль




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

дастаўляюцца кнігі ў чытальную залу (па спецыяльных вузкіх рэйках у кантэйнерах — гэта мы нават убачылі). Паназіралі, як працуюць чытачы ў самай вялікай чытальнай зале, даведаліся, што на трэцім паверсе можна заказаць ноты і самому выканаць на раялі ўпадабаны твор...

Але галоўнай «фішкай» экскурсіі стала наведванне міжнароднай выстаўкі «Францыск Скарына і яго эпоха», якая нядаўна распачала сваю работу ў сценах бібліятэкі. Гэта без перабольшання ўнікальная магчымасць пабачыць стрададрукі з розных краін, якія выдаваліся блізка па часе да скарынаўскіх кніг.

У тым ліку першая друкаваная кніга Еўропы — Біблія Гутэнберга (праўда, толькі адна старонка, прывезеная на выстаўку з Германіі, але ж — арыгінал!). Экспануюцца і знакавыя для беларускай кнігі — выданне трэцяга Статута ВКЛ, прывезенае з Латвіі, Біблія, выдадзеная ў першай друкарні на тэрыторыі сучаснай Беларусі — Берасцейскай, — яе прывезлі на выстаўку з Расіі. (Дарэчы, пытанне пра першую нашу друкарню ў другім туры віктарыны аказалася адным з самых складаных.) Ёсць чым пахваліцца і нашай кніжнай скарбніцы — на выстаўцы экспануецца арыгінал «Боскай камедыі» Дантэ Аліг'еры 1481 года выдання, які захоўваецца ў беларускай «нацыяналцы». Унікальная гэта кніга яшчэ і тым, што гравюры ў ёй выкананы паводле эскізаў вялікага Сандра Бацічэлі. Так што, калі хто скажа, што работ гэтага вялікага мастака Адраджэння ў нас няма, — гэта не зусім так.

І, вядома, кнігі самога Скарыны. Ажно 63! Тыя, што ёсць у Нацыянальнай бібліятэцы (іх у нас усяго дзесяць), а таксама прывезеныя з розных краін. Кожная сама па сабе — вялізная каштоўнасць. Асабліва цікавыя экспанаты — віленскія выданні «Малой падарожнай кніжкі» ў трох варыянтах. Адзін з іх нядаўна набыў для сваёй калекцыі «Белгазпрамбанк», другі прыехаў у Мінск са Славеніі, трэці — з Расіі. Кнігі не аднолькавыя: у «Малой падарожнай кніжцы» Скарына пераплятаў розныя брашуры-часткі Святога Пісання, таму кожны томік адрозніваецца ад іншага.

У канцы экскурсіі ўсе падняліся на агляднук пляцоўку на даху бібліятэкі і, нягледзячы на дождж, змаглі палюбавацца панарамай вясеньскай сталіцы.

Спадзяёмся, нават тыя нашы чытачы, што прыехалі здалёк, не пашкадавалі. Мы ж абяцаем, што «Мая Скарыніяна» была не апошняй на старонках і на сайце «Звязды» віктарынай.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**
*alena@zviazda.by*

# У АКЦЯБРСКАЙ АДСВЯТКУЮЦЬ ДВА ЮБІЛЕІ




Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калісьці адзін з самых прыкметных будынкаў вёскі — чатырохпавярховік на цэнтральнай плошчы — упрыгожвала рэльефная кампазіцыя з сярпа, молата, сонца і шасцярні. Як расказвалі ў сельскім выканкаме, эмблема — неафіцыйны сімвал аграгарадка. З часам барэльеф прыйшоў у аварыйны стан і быў дэманціраваны. Цяпер застаўся толькі яго адбітак, які кідаецца ў вочы сваёй загадкавасцю. Ініцыятыўныя жыхары закупілі матрэйялы і зрабілі эскіз, каб аднавіць спадчыну. Для нанясення графічнага малюнка па контуры засталося знайсці пад'ёмнік.

У гэтыя дні шмат чаго робяць у парку імя 50-годдзя СССР. Ужо ўсталявалі стэнды, прысвечаныя гісторыі вёскі. Стварылі куточкі для сямейнага адпачынку.

У Акцябрскую на работу штодня прыязджае нямала гараджан. Напрыклад, ва ўстановы сацыяльнага прызначэння. Гарадскіх вабяць і сельскія даплаты — 20%. А ў савецкі час тут было прасцей вырашыць жыллёвае пытанне. У эксперыментальны пасёлак, першапачаткова разлічаны на 1200 жыхароў, пераязджалі людзі з усяго Савецкага Саюза. Зразумела, з асноўным маладыя сем'і. Да 1974 года ў Акцябрскай пражывала 600 чалавек, у 1978 годзе — 800. У канцы 1970-х у саўгасе працавала каля 1,3 тысячы чалавек!



Візіт ГАРБАЧОВА ў саўгас «Сялюты», 1983 год.

На сёння ў вёсцы больш за 2,6 тысячы пастаянна пражываючых.

— Гісторыя аграгарадка непарыўна звязана з саўгасам «Сялюты». Населены пункт — цэнтральная сядзіба гаспадаркі. Яе стварылі 6 сакавіка 1959 года як прыгарадную — па вытворчасці малака, гародніны і мяса, — расказвае **старшы навуковы супрацоўнік Віцебскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея Ганна ЛІПАВА**.

З 1964 года кіраваць саўгасам пачаў Уладзімір Арцёмавіч Адамовіч. З гэтага часу пачынаецца будаўніцтва вёскі. А ў 1967 годзе саўгас быў уключаны ў рэспубліканскі план эксперыментальнага сельскага будаўніцтва.

Там, дзе цяпер прыгожы гарадок, шмат папрацавалі меліяратары. Асушылі балота, прывезлі зямлю — ёсць аналогія з будаўніцтвам Санкт-Пецярбурга.



Хакейная каманда саўгаса «Сялюты» і яе капітан Леанід ХАМУСЬКОЎ. Пачатак 80-х.

## Вёска — савецкая мара!

Прысваенне ў 1972 годзе гаспадарцы ганаровага звання імя 50-годдзя СССР стала вяршыняй працоўнай славы калектыву.

— Практычна кожны тыдзень сустракалі розныя дэлегацыі: з рэспублік Савецкага Саюза, Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі, Венгрыі, ГДР, Францыі, Аўстрыі, Кубы, В'етнама, КНДР і іншых краін. Тройчы наведваў гаспадарку Пётр Машэраў. Быў тут з візітам Міхаіл Гарбачоў, сакратар ЦК КПСС па сельскай гаспадарцы, будучы генеральны сакратар, — працягвае Ганна Ліпава.

У 1970-я гады ў вёсцы ўзводзяцца эксперыментальныя дамы гарадскога тыпу з сучаснымі бытавымі выгодамі. Два жылых сектары былі аб'яднаны грамадска-гандлёвым цэнтрам і зонай адпачынку. У комплексе: Палац культуры (з глядзельнай залай на 400 месцаў), бібліятэка, музычная школа, садок, амбулаторыя, гандлёвы цэнтр з прамтаварнай і харчовай крамамі, кафэ-сталовая. Узвялі і чатырохпавярховы адміністрацыйна-бытавы комплекс.



Цэнтральная плошча з дзеючым фантанам. Сярэдзіна 70-х.

Там знаходзіліся кантора саўгаса, сельсавет, паштовае аддзяленне, ашчадная каса, АТС, камбінат бытавога абслугоўвання. І, у гэта цяжка цяпер паверыць, гасцініца.

Было праведзена добраўпарадкаванне тэрыторыі, разбіты паркавыя зоны, створаны штучны вадаём. А на цэнтральнай плошчы запрацаваў фантан.

Найлепшыя выпускнікі ВНУ марылі працаваць у вёсцы. Дзеці пайшлі вучыцца ў новую школу. Напрыканцы 1970-х запрацавала ПТВ механізацыі сельскай гаспадаркі. Яно і цяпер функцыянуе.

У 1980 годзе адкрылі Дом быту. Установа аказвала жыхарам вёскі звыш 20 відаў паслуг. А ў наступным годзе, напярэдадні кастрычніцкага свята, адкрылі адзін з найлепшых у СССР дзіцячы садок-яслі.

## Велікану прысвячаецца

У музеі можна ўбачыць выставу, прысвечаную піянерскаму руху і 100-й гадавіне рэвалюцыі. Аднак тут шануюць не толькі савецкае мінулае. Завяршаецца стварэнне экспазіцыі «Веліканаў хутар» — пра самага высокага ў свеце беларуса Фёдара Махнова (гады жыцця — 1878—1912). Пра яго «Звязда» расказвала. І ў наш час даследчыкі спрачаюцца, якім менавіта быў яго рост. Мяркуецца, што больш за 285 сантыметраў!

Сярод экспанатаў — фанерны сілуэт велікана. Можна прымерыць «яго штаны», далонь, вусны, копію кальца дыяметрам з рубель царскіх часоў... Плануецца ўсё, што звязана з Махновым, прымусяць працаваць на брэнд раёна.

**Дар'я АНДРОНАВА, загадчыца аддзела аматарскай творчасці Віцебскага раённага цэнтра культуры і творчасці,** падзялілася планамі аб правядзенні фестывалю, прымеркаванага да дня памяці Фёдара Махнова:

— Задумалі арганізаваць квэст «У госці да велікана», выступы цыркачоў, бо ён з цыркам пабываў у многіх краінах. Плануем таксама парад веліканаў, інсталяцыі вялікіх прадметаў быту, спаборніцтва «Волаты Віцебшчыны» і іншае.

Дарэчы, Акцябрская — не адзінае месца, дзе можна даведацца пра самага высокага ў свеце беларуса. У вёсцы Старое Сяло Віцебскага раёна ў школе таксама ёсць тэматычны куточак, там можна ўбачыць асаблівы каштоўны экспанат — каркас ложка велікана. Захавалася і магіла недалёка ад хутара, дзе ён жыў.

Акцябрская, як бачым, здолела захаваць шмат энтузіястаў, якія шчыра любяць месца, дзе жывуць і працуюць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*
**Фота з архіва музея.**

■ Сезон

## Дагнаць зайца

### Кулявыя патроны нават насіць нельга

**Згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, у краіне дазволена здабыча зайца-русака і зайца-беляка любога полу і ўзросту ў светлы час сутак.**

Рабіць гэта можна зброевым спосабам з падыходу з ганчакамі, якія маюць палявыя дыпломы па зайцы і (або) лісіцы, пры гэтым з адным ганчаком могуць паляваць да трох паляўнічых. Дазваляецца выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю з выкарыстаннем патронаў са шротам. Можна паляваць і бяззброевым спосабам — з хартамі, лоўчымі птушкамі.

— Паляванне з ганчаком можна аднесці да аднаго з самых паспяховых паляванняў на зайца. Аднак азарт не павінен паўплываць на выкананне правілаў, — заўважылі ў Дзяржінспекцыі. — Адпраўляючыся на паляванне, уважліва вывучыце граніцы паляўнічагаспадарчых зон і іншых адзінак унутрыгаспадарчага дзялення тэрыторыі ўгоддзяў, у якіх дазваляецца альбо забараняецца праводзіць паляванне ў адпаведнасці з наяўнай пуцёўкай. Пры паляванні на зайца недапушчальна прымяненне і нават нашэнне кулявых патронаў і карцечы дыяметрам больш за 5 міліметраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Уклад магілёўскіх мытнікаў

**Сёлета Магілёўская мытня пералічыла за 9 месяцаў у рэспубліканскі бюджэт 156 мільёнаў рублёў розных плацяжоў — на 37% больш, чым летась.**

Як паведамілі прадстаўнікі ведамства, дасягнуты значныя вынікі па часе здзяйснення мытных аперацый. Так, за 9 месяцаў года 82% тавараў, якія вывозіліся з тэрыторыі ЕАЭС, былі афармлены менш чым за 5 хвілін, а 68% тавараў, якія, наадварот, увозіліся, прайшлі мытную працэдуру менш чым за 2 гадзіны. Выпуск больш як 98% тавараў пад мытную працэдуру мытнага транзіту заняў менш за 10 хвілін. Гэта сведчыць аб павелічэнні транзітнай прывабнасці нашай краіны, садзейнічае развіццю бізнес-супольнасці рэгіёна, а таксама ўмацаванню знешнеэканамічных сувязяў і канкурэнтаздольнасці Рэспублікі Беларусь у цэлым, падкрэслілі магілёўскія мытнікі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# РАЗМЫТЫЯ КРЫТЭРЫІ «САЦЫЯЛЬНАЙ НЕБЯСПЕКІ»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але ж спрэчкі гэтыя паміж дарослымі, да сваіх дзяцей яны ставяцца як належыць і выхоўваюць іх як трэба. Як тут рэагаваць? Па першым часе ніхто не будзе прымаць кардынальных мер. Аднак, калі выклікі міліцыі працягнуцца, установы адукацыі будуць проста вымушаны рэагаваць і ставіць дзяцей у сацыяльна небяспечнае становішча.

— Кожны раз, як дзеці трапляюць у сацыяльна небяспечнае становішча, узнікае пытанне: ці правільная гэта мера? Або, наадварот, — ці не запозна прынятая? Ступень умяшальніцтва ўстаноў адукацыі ў жыццё сям'і заўсёды павінна быць дакладна разлічана. Акрамя таго, гэта цягне за сабой не толькі арганізацыю работы з іх сем'ямі, але і шмат папяровай руціны, вельмі вялікай. Нават калі ў малога няма праблем з вучобай ці здароўем, усё гэта павінна быць прапісана ў дакументах. Здараецца, дзяцей не ставяць у сацыяльна небяспечнае становішча, каб пазбегнуць гэтых праверак і афармлення папер, — сцвярджае Зінаіда Вараб'ёва. — У той жа час нашы педагогі вельмі адказныя людзі і ведаюць, што рэагаваць на самае нязначнае праяўленне падобных праблем трэба тэрмінова, каб работа праводзілася ў час і малыя заставаліся ў сваіх сем'ях.

У сталіцы ў сацыяльна небяспечным становішчы знаходзяцца 1963 дзіцяці, аднак насамрэч тых, хто выклікае пэўную заклапочанасць, чые паводзіны або вучоба насцярожваюць, але пра каго няма падстаў сказаць, што яны знаходзяцца ў такім становішчы, значна больш, упэўнена спецыяліст Мінгарвыканкама.

— Магчыма, трэба вярнуць ва ўстановы адукацыі такое паняцце, як унутрышкольны кантроль, — разважае Зінаіда Вараб'ёва. — Напрыклад, калі непаўналетні кепска вучыцца, гэта яшчэ не значыць, што ў сям'і няма ўмоў для належнай падрыхтоўкі дамашніх заданняў. Вывучаючы сітуацыю, даведваешся, што такому дзіцяці проста няма каму дапамагчы, таму што бацькі з нізкім узроўнем адукацыі і не разумеюць, што рабіць. Значыць, такому вучню патрэбна асаблівая ўвага — магчыма, псіхолага-педагагічная, магчыма, дадатковыя заняткі, — каб неяк падцягнуць вучобу.

Выпадкі адабрання дзяцей з сям'яў з прычыны таго, што яны былі прызнаныя асобамі, якія маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, таксама трэба дасканала вывучаць, бо існуе шмат спрэчных момантаў у такіх сітуацыях, лічыць спецыяліст:

— На тое, каб прызнаць, што дзіця мае патрэбу ў абароне дзяржавы, павінна быць важкая прычына — калі малому небяспечна заставацца ў сваёй сям'і, бо бацькі не клапоцяцца пра яго, не забяспечваюць яго развіццё і базавыя патрэбы ў ежы, адзенні, прытулку. Не даюць яму магчымасці атрымліваць адукацыю, калі зачынілі ў чатырох сценах і не выпускаюць у соцыум, і непаўналетні не развіваецца як асоба, не рыхтуецца да самастойнага жыцця, не можа сам нічога зрабіць. Але ж калі бацькі не заплацілі за кватэру, бо на той момант засталіся без работы, ці яшчэ там што здарылася, дык такой сям'і трэба дапамагчы. Тым больш што адключыць святло ці газ там, дзе ёсць непаўналетнія дзеці, можна толькі са згоды органаў апекі і папячыцельства. І калі такое здараецца, значыць сям'я ўжо была прызнаная сацыяльна небяспечнай і прайшла ўсе магчымыя тэрміны, што даюцца на выпраўленне сітуацыі. Адна запазычанасць за месяц па «камуналцы» не можа стаць прычынай адабрання дзяцей...

Як бачым, спецыялісты, якія працуюць непасрэдна ў сферы абароны правоў дзяцей, выказваюць думку, што крытэрыі небяспечнасці гэтай абароны трэба ўдакладніць і падкарэктаваць. Напэўна, і праўда, час задумацца аб гэтым. Бо кожны раз, калі прымаецца рашэнне аб прызнанні сям'і ў сацыяльна небяспечным становішчы, вырашаецца ні многа ні мала — канкрэтны лёс як мінімум аднаго маленькага чалавека.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## О проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан в Ушачском районе Витебской области

**Организатор:** Жарский сельский исполнительный комитет

| Лот | Местонахождение земельного участка, площадь, кадастровый номер | Условия и ограничения, инженерно-геологические условия | Сумма, подлежащая возмещению затрат на формирование и регистрацию участка, руб. | Начальная цена лота, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Городец, Ушачского р-на, Витебской обл. площадь 0,2477 га кадастровый №224982402601000064 | земли в водоохранных зонах объектов, озеро Большое Исно, река Ушача | 1598,49 Кроме того, расходы на организацию и проведение аукциона | 3000.00 Задаток 10% 300,00 |
| 2 | д. Звонь, Ушачского р-на, Витебской обл. площадь 0,1096 га кадастровый №224982406601000036 | земли в водоохранных зонах объектов, озеро Звонь | 1512,29 Кроме того, расходы на организацию и проведение аукциона | 2500.00 Задаток 10% 250,00 |

*иженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ, здания на участках отсутствуют. Условия развития инфраструктуры: возможность подключения к инженерным сетям.

Целевое назначение участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, назначение в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества 1 09 02 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома).

1. **Аукцион состоится 24 ноября 2017 г. в 10.00 в здании Жарского сельского исполнительного комитета по адресу: 211527 д. Жары, ул. Центральная д.18, Ушачского района, Витебской области**. Заявления и пакет документов на участие принимаются по рабочим дням **с 8.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений и документов – **20 ноября 2017 г. до 17.00.**

2. Аукцион проводится в соответствии с Положением, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462.

3. Сумма задатка перечисляется на р/с BY84AKBB36413280400232300000 ф-л №216 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Полоцк БИК AKDDY21216 УНП300007203, код платежа – 04901, получатель – Жарский сельский исполнительный комитет.

Контактные номера тел.: 80215852494, 80215852499.

## Извещение об открытом аукционе по продаже права заключения договора аренды земельного участка для строительства объекта в городе Гродно 28 ноября 2017 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации, руб. | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Право аренды земельного участка У-2 сроком на 25 лет | Скидельское шоссе в районе Гродненской ТЭЦ-2 | 0,7446 | 440100000001010127 | 39 037,03 | 3 900,0 | 3 375,0 | Строительство объекта производственного назначения |

* земельный участок имеет ограничения.

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале №400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: Паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 28 ноября 2017 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет №57, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 23 октября по 22 ноября 2017 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-05-46**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно микрорайоны «Заболоть», «Барановичи-5,6», ул. Кульбакская) 28 ноября 2017 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-158 * | микрорайон «Заболоть» | 0,0999 | 440100000002007810 | – | 13 156,09 | 2 700 |
| 2 | Земельный участок У-309 * | микрорайон «Барановичи-5,6» | 0,0979 | 440100000001005891 | – | 11 685,81 | 2 300 |
| 3 | Земельный участок У-2* | ул. Кульбакская в районе жилого дома №35 | 0,1086 | 440100000001010124 | 3 400,0 | 23 442,09 | 4 700 |

* Инженерные коммуникации на участке отсутствуют.

Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 №49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

Аукцион состоится 28 ноября 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).

Для участий в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594 получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;

представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. 57 с 23 октября по 22 ноября 2017 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 46, 72 05 37, официальный сайт организатора торгов – www.grodno.gov.by

## БПС-СБЕРБАНК

**Уважаемые Владельцы (физические лица)**

**текущих (расчетных) счетов, в том числе с использованием банковской платежной карточки, благотворительных счетов (далее – Счет), открытых в ОАО «БПС-Сбербанк» (далее – Банк), по которым отсутствуют операции в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету (далее – неактивные счета)!**

Сообщаем Вам, что в соответствии со ст. 206 Банковского кодекса Республики Беларусь банк вправе прекратить обязательства по договору об открытии Счета при соблюдении и наступлении условий, предусмотренных указанной статьей, а также договором об открытии Счета.

Настоящим уведомляем Вас об отсутствии по Вашему Счету операций в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету, а также предупреждаем о прекращении обязательств Банка по соответствующим договорам по истечении шести месяцев, начиная с даты настоящего уведомления. Обязательства по договорам текущих (расчетных) счетов с использованием банковской платежной карточки, будут прекращены Банком по истечении шести месяцев со дня прекращения срока действия соответствующей банковской платежной карточки.

Если в течение 6 месяцев, начиная с даты настоящего уведомления, Вы не возобновите движение денежных средств по неактивному счету, Банк прекратит обязательства по соответствующему договору и закроет его, перечислив неиспользованный остаток денежных средств на отдельный счет без начисления процентов, и по истечении срока, установленного законодательством Республики Беларусь, зачислит его в доход Банка.

При этом Банк обязуется возвратить по требованию Владельца неактивного счета остаток денежных средств, находившихся на данном счете на момент его закрытия.

Операции по неактивному счету можно совершить в любом подразделении Банка.

**Информацию о режиме работы подразделений можно получить по телефону:**

**148 – в стационарной сети.**
**5-148-148 – в мобильных сетях.**
**(+375 29/44) 5-148-148 – для международных звонков.**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь №4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. №431/С-30639 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – одноэтажное кирпичное здание столовой), площадью 286,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. п. Кореличи, ул. Гастелло, 48 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 423355100001000731, площадью 0,0574 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли) по адресу: г. п. Кореличи, ул. Гастелло, 48 |
| **Начальная цена продажи** | 19 323,60 руб. (девятнадцать тысяч триста двадцать три рубля шестьдесят копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1932 руб. (одна тысяч девятьсот тридцать два рубля) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | ОАО «Кореличская сельхозтехника», 231430, Гродненская область, г. п. Кореличи, ул. Гастелло, 46, тел./факс 8-01596-215-62 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Y44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 13 ноября 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 18.07.2017 г.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30
(понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).
Последний день приема заявлений – 8 ноября 2017 г. до 15.00

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*http://grodnoino.by*

# КАРАНІ І КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя № 10 (26)




■ Актуальнае інтэрв'ю

# ПРАГМАТЫЗМ НЕ МОЖА БЫЦЬ БЕЗ ЛЮБОВІ

## МІНПРЫРОДЫ ТРЫМАЕ КУРС НА ІНАВАЦЫІ, МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА І ЗАХАВАННЕ ПРЫГАЖОСЦІ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

**Звычайна такія інтэрв'ю рыхтуюцца з нагоды 100 дзён на новай пасадзе. Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК атрымаў прызначэнне крыху больш за месяц таму, але графік яго працы, колькасць камандзіровак такія, што можна адзін дзень памнажаць на тры.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Андрэй Паўлавіч, вы правялі шмат азнаямленчых паездак па краіне. Як ацэньваеце ўбачанае? Перад прызначэннем вас на пасаду міністра Прэзідэнт паставіў задачу разабрацца з шэрагам праблемных пытанняў. Як прасоўваецца работа ў гэтым кірунку?***

— У цэлым задаволены тым, што ўбачыў у рэгіёнах. Больш падрабязна закрану адно з вострых пытанняў — забруджванне вод. Пры тым, што аб'ём сцёкавых вод, скінутых у паверхневыя водныя аб'екты ў 2016 годзе, скараціўся на 8,9% за кошт уводу ў эксплуатацыю 31 ачышчальнага збудавання сцёкавых вод, а таксама што больш эфектыўна працуюць такія збудаванні ў шэрагу гарадоў, падстаў для самазаспакаення няма.

За апошнія тры гады аб'ём скіду недастаткова ачышчаных сцёкавых вод павялічыўся ў 2,5 раза і ў 2016 годзе склаў 8,8 млн $м^3$, з якіх 6,8 млн $м^3$ (89,5%) ад прадпрыемстваў сістэмы ЖКГ у сувязі з аварыйнымі сітуацыямі, а таксама правядзеннем на тых збудаваннях работ па рэканструкцыі і мадэрнізацыі. Неэфектыўна працуюць агульнагарадскія камунальныя ачышчальныя збудаванні ў гарадах Мсціслаў, Шклоў, Браслаў, Сянно, Рагачоў, Фаніпаль, Лагойск, Беразіно, Любань і інш. Гэтая тэма знаходзіцца на пастаянным кантролі. А да ўсіх вінаватых службовых і юрыдычных асоб тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды прымяняюцца меры адміністрацыйнай адказнасці.

***— Раскажыце, калі ласка, на прыкладзе Гродзенскай вобласці, у якой вы доўгі час працавалі, аб міжнародным супрацоўніцтве ў сферы экалогіі.***

— На Гродзеншчыне ажыццяўляецца некалькі цікавых праектаў дзякуючы міжнароднай тэхнічнай дапамозе. У прыватнасці, праектам ЕС/ПРААН «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай» эканомікі» ў 2015—2017 гадах прадугледжана добраўпарадкаванне тэрыторыі экалагічнага інфармацыйнага цэнтра ДПУ «Рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Свіцязянскі», стварэнне фітаклуба. У горадзе Масты ажыццяўляецца дыспетчарызацыя і аўтаматызацыя сельскіх водазабораў з перадачай інфармацыі на цэнтральны дыспетчарскі пункт. У Лідскім раёне ствараецца рэгіянальны лясны экалагічны адукацыйны цэнтр. Цікавая пілотная ініцыятыва «Устойлівае земляробства, заснаванае на інавацыйным падыходзе фермерскай гаспадаркі «ВерміЭкапрадукт» і рэалізацыя экасістэмнай паслугі глебаўтварэння і кругазвароту пажыўных рэчываў» праводзіцца ў Смаргонскім раёне. Агульны бюджэт гэтых пілотных ініцыятыў больш за 500 тысяч долараў ЗША.

Таксама дзякуючы міжнароднай дапамозе праведзена рэканструкцыя экацэнтра заказніка «Азёры». Зараз актыўна рэалізуецца вельмі цікавы праект ГЭФ/ПРААН «Ліквідацыя бар'ераў для развіцця ветраэнергетыкі ў Рэспубліцы Беларусь». Выбраны дзве пляцоўкі ў Навагрудскім і Смаргонскім раёнах для праектавання на іх ветраэнергетычных установак з мэтай прыцягнення інвестараў.

***— Лічыцца, што з усіх відаў гаспадарчай дзейнасці турызм наносіць найменшую шкоду прыродзе. Як вы, Андрэй Паўлавіч, мяркуеце — экатурызм ужо стаў адным з брэндаў Беларусі?***

— Наша краіна валодае істотным патэнцыялам для развіцця экалагічнага турызму. І ён выкарыстоўваецца на досыць высокім узроўні нацыянальнымі паркамі «Белавежская пушча», «Нарачанскі», «Браслаўскія азёры», «Прыпяцкі», Бярэзінскім біясферным запаведнікам.

Экатурызм трэба і далей развіваць, але пры гэтым падпарадкоўваючыся дасягненню галоўнай мэты — захаванню біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці.

***(Заканчэнне на 8-й стар.)***



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Далучайцеся!

Мінпрыроды правяло суботнік па зялёным добраўпарадкаванні

# ПАЧНІ З МАЛОГА — ПАЧНІ З СЯБЕ!



Супрацоўнікі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя прывялі ў парадак і азялянілі тэрыторыю каля будынка ведамства па вуліцы Калектарнай у Мінску. Было высаджана больш за 200 саджанцаў туі, блакітнай елкі, ядлоўца казацкага, пузыраплодніка і іншых раслін. Пачатая сёлета работа будзе працягнута вясной.

«У чэрвені 2019 года Беларусь стане гаспадыняй II Еўрапейскіх гульняў. І адной з асноўных задач падрыхтоўкі да гэтай знакавай для нашай краіны падзеі з'яўляецца стварэнне такіх умоў, каб спартсмены і госці не толькі паказалі найлепшыя спартыўныя вынікі і атрымалі яркія эмоцыі, але і адпачылі душой і захацелі вярнуцца да нас зноў. Таму Мінпрыроды заклікае ўсіх жыхароў краіны далучыцца да кампаніі па зялёным добраўпарадкаванні і зрабіць беларускія гарады і пасёлкі яшчэ больш прыгожымі, чыстымі і зялёнымі», — расказалі ў прэс-службе ведамства.

**Вераніка КОЛАСАВА.** *kolasava@zviazda.by*
**Фота прэс-службы Мінпрыроды.**

■ Экатэхналогіі

# Аднавіць і зберагчы

### Вынікі чатырохгадовага праекта «Тарфянікі-2» — аднаўленне гідралагічнага рэжыму і прыняцце патрэбных дакументаў

**Тарфяныя балоты ў наступныя 20 гадоў дапамогуць знізіць выкіды парніковых газаў, скараціць колькасць пажараў і захаваць жыццё многім жывёлам і раслінам, лічаць спецыялісты.**

Усё гэта дзякуючы маштабнаму праекту «Тарфянікі-2», які на працягу чатырох гадоў фінансаваўся Глабальным экалагічным фондам і рэалізоўваўся Праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь. Поўная назва праекта: «Распрацоўка інтэграваных падыходаў да кіравання водна-балотнымі ўгоддзямі з улікам прынцыпу шматмэтавага ландшафтнага планавання з мэтай атрымання шматбаковых экалагічных выгад».

Па словах **кіраўніка праекта Аляксея АРЦЮШЭЎСКАГА,** дзякуючы будаўніцтву водарэгулявальных збудаванняў быў адноўлены гідралагічны рэжым дзевяці парушаных тарфянікаў у Магілёўскай, Мінскай, Віцебскай і Гродзенскай абласцях. А гэта каля 15 тысяч гектараў водна-балотных тэрыторый. Аднак самым важным дасягненнем праекта кіраўнік лічыць прыняцце і зацвярджэнне пастановай Савета Міністраў «Стратэгіі захавання і ўстойлівага выкарыстання тарфянікаў» і «Схемы размеркавання тарфянікаў па напрамках выкарыстання на перыяд да 2030 года» — дакументаў, якія дапамогуць рэгуляваць дзейнасць па захаванні і выкарыстанні тарфяных балот.

— Гэты праект даказаў, што экалогія і эканоміка — гэта не дыяметральна супрацьлеглыя паняцці. Яны павінны і могуць існаваць разам, — сказаў эксперт.

Важнасць эканамічных выгад адзначыў і **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ.**

— У аснове ўсяго, вядома, стаіць экалогія. Але не варта забываць і пра эканамічны бок. У межах праекта створана 13 водна-балотных заказнікаў, экалагічныя сцежкі, якія змогуць паказаць натуральную прыгажосць нашай краіны не толькі беларусам, але і замежным турыстам.

Дарэчы, яшчэ адзін важны складнік праекта — захаванне біяразнастайнасці на балотах. З гэтай мэтай у Лідскім раёне Гродзенскай вобласці на неэфектыўна асушаных тарфяных землях былі высаджаны чорнаалешнікі, якія з'яўляюцца месцам пражывання многіх уразлівых відаў жывёл і раслін. Акрамя гэтага, актывісты грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) стварылі сістэму захавальнікаў для найбольш значных водна-балотных тэрыторый.

— Вядома, супрацоўнікаў нашай арганізацыі недастаткова, каб кантраляваць стан усіх балот. Таму мы прыцягваем да работы валанцёраў з розных куткоў нашай краіны. І сёння ў нас ужо 120 пастаянных захавальнікаў, — расказаў **дырэктар арганізацыі Аляксандр ВІНЧЭЎСКІ.**

Эксперт дадаў, што ў абавязкі захавальнікаў уваходзіць пастаянны маніторынг замацаванай за імі тэрыторыі, пра вынікі якога яны паведамляюць супрацоўнікам АПБ. Таксама валанцёраў вучаць самастойна рэагаваць на парушэнні.

На гэтым работа па захаванні і аднаўленні тарфянікаў не заканчваецца. Цяпер ідзе рэгістрацыя праекта «Тарфянікі-3».

**Кацярына КІРЭЕВА.**
*katyakireeva@zviazda.by*

■ У свеце раслін

# Спыніць батанічную дыверсію

## У новай кнізе вучоныя расказалі, якія пагрозы нясе распаўсюджванне па тэрыторыі краіны раслін-прышэльцаў

**«Расліны-агрэсары. Інвазійныя віды на тэрыторыі Беларусі» — так называецца навукова-папулярнае выданне, складзенае спецыялістамі лабараторыі флоры і сістэматыкі раслін Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі, што сёлета ўбачыла свет. Галоўная яго мэта — пазнаёміць чытачоў з чужароднымі відамі раслін, якія актыўна размнажаюцца і шкодзяць чалавеку і біялагічнай разнастайнасці, а таксама падказаць метады барацьбы з агрэсарамі.**




— Кніга засяроджвае ўвагу на тым, што разам з абарыгеннымі, карыснымі і цікавымі раслінамі ёсць іншыя дрэвы і хмызнякі, на выгляд станоўчыя, але яны хаваюць розныя праблемы для насельніцтва, эканомікі краіны, — расказаў **кіраўнік лабараторыі, доктар біялагічных навук, прафесар Віктар ПАРФЁНАЎ.** Так, з добрымі намерамі ў сельскай гаспадарцы пачыналі выкарыстоўваць баршчэўнік Сасноўскага. Але варта было расліне выйсці з-пад кантролю, як яна пачала актыўна распаўсюджвацца і трансфармаваць мясцовую прыроду.

Праблема агрэсіўных чужародных (інвазійных) відаў раслін у навуковым свеце не новая. Але калі біёлагі ведаюць пра зялёных прышэльцаў даволі шмат, то многія звычайныя людзі, якія часцей за ўсё і «дапамагаюць» ім займаць усё большыя тэрыторыі, пакуль нават не здагадваюцца пра цёмны бок многіх раслін, напрыклад такіх прыгожых кветак, як бальзамін ці віргінская астра.

Каб выправіць гэту сітуацыю, вучоныя выбралі каля 50 відаў інвазійных раслін, якія найбольш агрэсіўна паводзяць сябе ў нашай краіне, зрабілі іх апісанне, адзначылі фактары пагрозы, а таксама далі канкрэтныя рэкамендацыі па абмежаванні колькасці і знішчэнні. Пазнаць чужынцаў можна і па фотаздымках, якія былі зробленыя аўтарамі падчас навуковых камандзіровак па Беларусі.

— Інвазійныя расліны — агрэсары не толькі ў адносінах да чалавека, але і да іншых раслін, — адзначыў адзін з аўтараў кнігі, **старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі флоры і сістэматыкі раслін Аркадзь СКУРАТОВІЧ.** — Яны кардынальна змяняюць тое асяроддзе, куды трапляюць. Напрыклад, калі бальзамін драбнакветкавы пасяляецца ў лесе, там больш не ўбачыць грыбоў ці ягад — такім шчыльным дываном ён разрастаецца.


Астра віргінская.

Якія ж зялёныя ворагі растуць побач з намі? У спіс трапілі не толькі ўжо вядомыя баршчэўнік Сасноўскага, сумнік канадскі і эхінацыстыс шыпаваты. Гэта і клён амерыканскі, які пры высечцы можа пускаць 10—15 парасткаў з аднаго ствала; дуб паўночны ці чырвоны — хуткарослая парода, якая выцясняе абарыгенны від дуб звычайны; рабінія псеўдаакацыя (белая акацыя), якая ўтварае цэлыя лясы на поўдні краіны; лубін мнагалісты, тапінамбур, чырвоная і чорная бузіна, дзявочы вінаград, ябляніха крушынападобная і іншыя прадстаўнікі групы каранцінных раслін і пустазелля.

Зразумела, не трэба адразу кідацца знішчаць усіх «акупантаў», што растуць на прысядзібных участках. Вучоныя падкрэсліваюць — многія з гэтых раслін маюць права на існаванне ў культуры, але пры ўмовах пастаяннага кантролю з боку людзей за іх колькасцю і правільнай утылізацыі. Так, рэшткі інвазійных раслін нельга выкідаць каля лесу ці на пустках — апынуўшыся ў натуральных умовах, чужынцы здольныя хутка разрастацца. А плады некаторых з іх, напрыклад чорнай бузіны ці іргі каласістай, пажадана збіраць з расліны цалкам, каб птушкі не разнеслі насенне па ваколіцах.

Толькі гаспадарлівы падыход — увага да таго, што расце каля дома, на ўскраінах вёсак, уздоўж дарог, пастаянная апрацоўка і засяванне шматгадовымі травамі зямлі, што пакуль не выкарыстоўваецца, праполка кветнікаў і агародаў — дапаможа зменшыць пагрозу ад агрэсараў для прыроды і чалавека.

**Вераніка КОЛАСАВА.** *kolasava@zviazda.by*

# ПРАГМАТЫЗМ НЕ МОЖА БЫЦЬ БЕЗ ЛЮБОВІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

***— Падпісаны паміж Беларуссю і Польшчай мемарандум аб аднаўленні воднага шляху Е-40 выклікаў у эколагаў і грамадскасці, мякка кажучы, неадназначную рэакцыю. А якая ваша пазіцыя па гэтым пытанні?***



— Пазіцыя міністэрства такая: работы павінны ажыццяўляцца пасля правядзення ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, на падставе праектнай дакументацыі, якая разам са справаздачай аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ва ўстаноўленым парадку павінна быць прадстаўлена на дзяржаўную экалагічную экспертызу. Мы зыходзім з таго, што закон «Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях» забараняе ажыццяўленне дзейнасці, у выніку якой аказваецца альбо можа быць аказана шкоднае ўздзеянне на прыродныя комплексы і (або) такія тэрыторыі. Таксама на тэрыторыі нацыянальнага парку забараняецца дзейнасць, якая вядзе да змянення гідралагічнага рэжыму.

Улічваючы, што праект можа мець трансгранічнае ўздзеянне, неабходна прадугледзець выкананне ўсіх палажэнняў Канвенцыі аб АУНА ў трансгранічным кантэксце.

***— Міністэрства актыўна прасоўвае ідэі па пераходзе да «зялёнай» эканомікі. Якія з іх ужо паспяхова рэалізуюцца?***

— У краіне прыняты шэраг дакументаў, накіраваных на развіццё «зялёнай» эканомікі. Паралельна, пры ўдзеле міжнародных партнёраў, рэалізуюцца мерапрыемствы па экалагізацыі асобных тэрыторый, вытворчасцяў на прыкладзе 23 пілотных ініцыятыў, якія распаўсюджваюцца на ўсе рэгіёны. Сёння можна казаць пра станоўчыя вынікі, дасягнутыя ў рамках рэалізацыі гэтых праектаў.

Напрыклад, у Барысаве на УП «Папяровая фабрыка» Дзяржзнака ўстаноўлена першая партыя абсталявання для лініі вытворчасці офіснай паперы з другасных рэсурсаў. На прадпрыемстве «Камунальнік» пастаўлены комплекс абсталявання для драбнення драўняных адходаў у біяпаліва для выкарыстання ў кацельні. У Жыткавічыхімсэрвісе ўстаноўлена абсталяванне па транспарціроўцы і перагрузцы сапрапелю, што дазволіць адкрыць вытворчасць высокаэфектыўных арганічных угнаенняў. Завершана мадэрнізацыя вытворчасці лакальных ачышчальных збудаванняў ва Уздзенскім раёне.

Асабліва падкрэслю, што ў выніку рэалізацыі 16 ініцыятыў грамадскіх арганізацый створана 50 новых працоўных месцаў, 270 чалавек атрымалі дадатковае працаўладкаванне.

Новым напрамкам, які мы падтрымліваем, з'яўляецца развіццё «зялёных» устойлівых гарадоў. Так, у Брэсце будзе ўкаранёна канцэпцыя «Сімбія-Сіці», якая прадугледжвае стварэнне разумнага, экалагічна і эканамічна, сацыяльна адказнага горада. Адзначу і праект «Падтрымка зялёнага горадабудаўніцтва ў малых і сярэдніх гарадах Беларусі (Зялёныя гарады)». Ён ажыццяўляецца ў Полацку, Наваполацку і Навагрудку.

***— Міжнародныя структуры і беларускія грамадскія арганізацыі ажыццяўляюць нямала праектаў, накіраваных на экалагічную адукацыю дзяцей. Ці ёсць у Міністэрства планы па актывізацыі работы, развіцці разнастайнасці формаў выхавання ў падрастаючага пакалення прыязнага стаўлення да прыроды?***

— Безумоўна, мы ўдзячныя нашым партнёрам за тую работу, якую яны праводзяць. Дзеці сёння дастаткова эрудзіраваныя ў пытаннях экалогіі. Мы бачым сваёй асноўнай задачай прыцягненне школьнікаў, студэнтаў ды і ўсяго насельніцтва да навядзення парадку на зямлі. Перакананы, што пасля ўдзелу ў акцыі «Зробім!» чалавек не будзе выкідаць смецце каля вадаёма ці ў лесе. Таму ўсіх заклікаю актыўна ўдзельнічаць у добраўпарадкаванні тэрыторый. Мы гэта робім не для кагосьці, а для сябе, бо прыемна знаходзіцца там, дзе чыста і камфортна.

***— Нядаўна вы сустракаліся з калегамі з дзяржаў-удзельніц СНД. Было падпісана міжурадавае Пагадненне паміж Беларуссю і Расіяй аб стварэнні трансгранічнай ААПТ «Запаведнае Паазер'е».***

— У склад «Запаведнага Паазер'я» ўвайшлі з беларускага боку заказнікі «Асвейскі» і «Чырвоны Бор», з расійскага — нацыянальны парк «Себежскі». Хачу адзначыць, што нашы заказнікі з'яўляюцца біясфернымі рэзерватамі — месцамі, дзе ахоўваюцца ўчасткі малапарушаных экасістэм з рэдкімі і знікаючымі відамі жывёл і раслін. Цяпер і расійскі бок распрацоўвае навуковае абгрунтаванне абвяшчэння «Себежскага» біясферным рэзерватам. У перспектыве гэта дазволіць падрыхтаваць і падаць намінацыйную заяўку для ўключэння трансгранічнай тэрыторыі «Запаведнае Паазер'е» ў Сусветную сетку біясферных рэзерватаў ЮНЕСКА. Гэта будзе першая для Беларусі і Расіі ахоўная прыродная тэрыторыя такога высокага міжнароднага статусу.

Дарэчы, ва ўсім свеце толькі 16 такіх трансгранічных біясферных рэзерватаў. Сярод іх і Белавежская пушча — у Беларусі з Польшчай, Вялікі Алтай — у Расіі з Казахстанам.

***— Ці плануецца рэарганізацыя міністэрства і падпарадкаваных яму ўстаноў?***

— Сёлета праведзена аптымізацыя цэнтральнага апарата Мінпрыроды і яго тэрытарыяльных органаў, такім чынам з 1 верасня скарацілася колькасць дзяржаўных служачых у нашай сістэме. Таксама з катэгорыі дзяржслужачых выключаны тэхнічныя работнікі.

У ліпені завершана рэарганізацыя Белгідрамета шляхам далучэння да яго абласных цэнтраў, што дало магчымасць павысіць эфектыўнасць кіравання гэтай службай. Зараз прымаюцца меры па павышэнні якасці работы Белгідрамета ў частцы прагназавання надвор'я. Тэрыторыя краіны не цалкам пакрыта метэастанцыямі, што, натуральна, пагаршае вынік прагназавання. Вызначыўшы канкрэтныя пункты, мы плануем стварыць каля 20 новых аўтаматычных метэастанцый. Не менш за 30% метэастанцый, якія сёння дзейнічаюць, маюць патрэбу ў мадэрнізацыі.

Акрамя таго, Мінпрыроды імкнецца сумесна з прадстаўнікамі навукі, сферы інфармацыйных тэхналогій укараніць сучасныя інавацыйныя распрацоўкі. Беспілотнікі, квадракоптары, фота- і відэапасткі могуць замяніць некалькі чалавек «у полі». Канчатковая мэта рэарганізацыі — найбольш эфектыўнае размеркаванне наяўных матэрыяльных і кадравых рэсурсаў.

***— Андрэй Паўлавіч, у вас рэпутацыя моцнага гаспадарніка і эканаміста. Ці не азначае гэта, што і да прыроды вы будзеце ставіцца вельмі рацыянальна?***

— Прызначаючы мяне на пасаду, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб сваім надзвычай паважлівым стаўленні да прыроды. Думаю, менавіта так кожны чалавек павінен ставіцца да яе. Якім бы эфектыўным ні было міністэрства, без падтрымкі насельніцтва, кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый не атрымаецца зберагчы і прымножыць нашы прыродныя багацці. Безумоўна, кіраваць прыроднымі рэсурсамі трэба рацыянальна, разумеючы, што яны не бязмежныя. Аднак пры ўсім прагматызме я лічу, што любоў да прыроды, роднай зямлі — гэта абавязковы складнік характарыстыкі міністра прыродных рэсурсаў і ахоў навакольнага асяроддзя.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
*yanovskaya@zviazda.by*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Аматары-натуралісты

# ФОТАСНАЙПЕР — ЗАНЯТАК ЦЯРПЛІВЫХ

**Як казаў герой з мультфільма «Трое з Прастаквашына», «фотаружжо — гэта і паляванне, і звяроў забіваць не трэба». Мікалай ГУЛІНСКІ з Гродна — фотаснайпер. Інакш кажучы, ён — «назіральнік за птушкамі» ці «бёрдвотчар». Што ж, рэдкая птушка схаваецца ад такога чалавека. Сваім прыкладам Мікалай даказаў: у 60 пачынаецца новае жыццё, і яно вельмі цікавае.**



## З «ОРГАНАЎ» — У ТВОРЧАСЦЬ

Ён, колеру лістоў і травы, маскіруецца на зямлі, а можа і на суседнім дрэве. Чакае гадзіну, дзве, тры, нават сем. Дождж, слота, мароз, спёка, вецер. На бераг Нёмана рэдкія крылатыя госці залятаюць і пад хмурным небам.

«Вось вусатыя сініцы, такія сімпатыгі! Бачыце, якія гусарскія вусы ў галавы іх самыя сямейства? *(разглядаем кадры)* Далей — шэрыя журавы, разумныя і асцярожныя. А гэта — малы арлец, з якога і пачалася мая гісторыя», — кажа назіральнік птушак.

Дарога Мікалая Гулінскага ў фотапаляванне ўнікальная. Фотаружжо мужчына ўзяў пасля шасцідзесяці, калі ўступіў у ціхае жыццё беларускага пенсіянера. «Ведаеце, раней думаў: пайду на пенсію, а чым жа займацца буду? Хоць я нарадзіўся і вырас у вёсцы ў Берастаўвіцкім раёне, але дачная справа мяне мала цікавіла, а захапляла прырода, жывёльны свет, асабліва птушкі», — дзеліцца наш герой.

Да гэтага ён не займаўся ні фота, ні творчасцю. Спачатку чыгуначны інстытут і размеркаванне ў Ліду інжынерам, затым школа КДБ і праца ў Магілёве. На пенсію Мікалай Гулінскі выйшаў палкоўнікам. А цяпер калегі па фотапаляванні прызнаюць яго самым тытулаваным бёрдвотчарам на Гродзеншчыне.

І вось ужо 17 гадоў Мікалай дабывае кадры-трафеі. Яны ўпрыгожваюць замежныя анімалістычныя кнігі, часопісы, а таксама вокладкі айчынных «Роднай прыроды», «Лесавіка», творы Алеся Бадака і Уладзіміра Ягоўдзіка. Мужчына расказвае пра свае прыгоды сціпла, дзякуе сыну Віктару за спонсарства і падтрымку, а жонцы Ядзвізе — за каханне і цярпенне.

## ЧАЙКА З АЛЯСКІ І ЗАКАХАНЫ ЛОСЬ

«А вось гэта мой самы каштоўны кадр *(любуемся іншаземнай птушкай)*. Упершыню за ўвесь час назірання на тэрыторыі Беларусі ўбачылі ціхаакіянскую чайку. Larus schistisagus, — па-лацінску называе птушку Мікалай Гулінскі. — Мясцовыя шэрыя вароны сустрэлі заморскую госцю варожа, хадзілі за чужаніцай кругамі. А яна ў пайтара раза за іх буйнейшая! Нагадаю, ціхаакіянская чайка родам з Камчаткі, Чукоткі і Аляскі. Яна пралцела 10 тысяч кіламетраў, каб завітаць у сэрца Гродна. Птушка стаяла каля старога моста цераз Нёман, калі фотаснайпер «выстраліў». Цяпер яна пазірае з іншамоўных часопісаў: англійскага «Birding world» і нямецкага «Dutch birding».

Пытаюся: «Кажуць, ласёў лепш здымаць ранняй восенню, бо ў вераснi яны думаюць пра адно каханне. А таму і добра «пазіруюць» падчас фотасесіі. Гэтакія «закаханыя зоркі-мадэлі» *(смяёмся)*! А з птушкамі як?»

«Тая ж самая песня, — адказвае Мікалай Гулінскі. — Галоўны прынцып: не спужай птушку, калі яна наседжвае носку. Праўда, з рознымі відамі па-рознаму. Напрыклад, вусатыя сініцы гняздуюцца ў трысняговых джунглях зімой і летам. Яны аб'екты зусім не капрызныя. І рамес, сімпатычная птушачка, гнязло якой нагадвае цёплую рукавічку, таксама таварыскі. А вось драпежны вялікі арлец успрымае чалавека хваравіта, можа кінуць гняздо».

## ГЕРАІЗМ КАЧКІ-МАЦІ І ПАДАРУНАК ЛЁСУ

«На возеры Юбілейным, што каля Гродна, з'явіўся чорнаваллёвы гагач. Гэта рэдкая для Беларусі птушка, яна жыве толькі на поўначы Віцебскай вобласці. Я стаў сведкам найцікавейшай сітуацыі, — інтрыгуе Мікалай Гулінскі. — У чэрвені ў дзікіх качак-крыжанак з'яўляецца патомства. На гэтым возеры плавала некалькі такіх сямействаў. А чорнаваллёвы гагач адчуў сябе гаспадаром, выказаў агрэсію. Маўляў, я тут валадар водаў, а вы — нейкія качкі. Прэч! Многія мамы ўспрымалі пагрозу і плылі назад. А адна з малымі — іх было восем — не звярнула ўвагі. Бачу: гагач нырнуў. Думаю: вынырне каля крыжанкі, гэта далекавата. А ён вынырнуў пасярод качанят — і яны, бы пушынкі, разляцеліся ўбакі. Мацікачка, канешне, адстаяла сваіх малых *(паказвае ваяўнічыя фота)*».



Фота Мікалая ГУЛІНСКАГА.

Звыклая геаграфія фотапрыгод Мікалая Гулінскага — Берастаўвіцкі, Гродзенскі раёны. Так, фотаснайпер часты госць у заказніку «Азёры», на абрывістых берагах Ласасянкі. Бывае ён і на Міншчыне.

«Мне было за 60, калі я ўзяў фотаапарат, — кажа Мікалай. — Здавалася, ну, што табе, дзеду, там рабіць? Трэба кола знаёмых, веды, цярпенне, вытрымка. Але галоўнае — я не стамлюся гэта паўтараць! — цікавасць. Няважна колькі вам гадоў, якая адукацыя і чым займаліся да гэтага, усё атрымаецца. Толькі майце цікавасць! А ў Беларусі больш як тры сотні відаў птушак — мадэляў хапае. І вы самі, і вашы бабулі, дзядулі — калі ласка!»

**Маргарыта САДОЎСКАЯ**

■ У свеце жывёл

# НЕ КІДАЙЦЕ Ў КАЖАНА ТАПКАМ!

## Рукакрылыя істоты прыносяць нямала карысці



Фота Аляксея ШПАКА.

**У сярэдзіне снежня ў Мінску павінен з'явіцца цэнтр па выратаванні кажаноў «Кажанаполіс». Для гэтага сталічныя актывісты грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» ўдзельнічаюць у конкурсе сацыяльных праектаў Social Weekend. Сабраныя грошы пойдуць на куплю абсталявання, халадзільнікаў, корму, а таксама арэнду памяшкання.**

Навошта ў Беларусі патрэбны такі цэнтр і чаму рукакрылым неабходна дапамога чалавека, даведаліся ў аднаго з **куратараў праекта, спецыяліста па кажанах, навуковага супрацоўніка лабараторыі малекулярнай заалогіі НПЦ па біярэсурсах НАН Беларусі Аляксея ШПАКА.**

Кажаны — вельмі ўразлівая група жывёл. Яны не будуюць гнёзды, таму вымушаныя шукаць сховішча ад драпежнікаў і неспрыяльных умоў надвор'я.

— Калі ў Еўропе кажаны могуць жыць у пячорах, скальных трэшчынах, падзямеллях, то ў Беларусі, з прычыны адсутнасці такіх, яны жывуць у асноўным на паддашках, пад стрэхамі, у скляпах і падвалах і г. д., — расказвае спецыяліст.

Блізкасць рукакрылых да чалавека прыводзіць да непазбежнага канфлікту «чалавек — дзікая жывёла». Яшчэ больш алею ў агонь падліваюць стэрэатыпы пра «кажаноў-вампіраў», якія склаліся ў грамадстве. На самай жа справе гэтыя жывёлы жывяцца насякомымі. Праўда, па словах спецыяліста, тры віды рукакрылых усё ж п'юць кроў, але пераважна буйных дамашніх жывёл. І жывуць яны толькі ў Паўднёвай Амерыцы.

— Кажаны знішчаюць шкоднікаў лясной, сельскай і паркавай гаспадарак. За ноч яны з'ядаюць такую масу насякомых, якая складае каля палову масы іх уласнага цела. Амерыканскія эколагі палічылі, што для штата Тэхас кажаны штогод эканомяць мільярды долараў, — адзначыў эксперт.

Але не толькі эканоміка прымушае берагчы начных звяркоў. Кажаны — важныя складнікі экасістэмы, і іх знікненне прывядзе да парушэння прыроднага ланцужка.

— У Еўропе ўсе віды рукакрылых ахоўваюцца. У нас жа пакуль з 19 відаў толькі 8 — у Чырвонай кнізе, — расказаў Аляксей Шпак. — Часцей за ўсё ў Мінску можна сустрэць чатыры віды рукакрылых: рудую вячэрніцу, двухколернага кажана, позняга кажана, чырванакніжнага паўночнага кажанка.

Па словах эксперта, як мінімум два фактары пагражаюць знікненнем кажаноў: натуральны і антрапагенны. Асноўны фактар натуральнага паходжання — гэта нізкая паддавітасць мышэй. За год яны нараджаюць 1—2 дзіцянаці, з-за чаго іх колькасць не можа расці хутка.

Антрапагенных жа фактараў, якія ўплываюць на жыццё рукакрылых, значна больш. Зразанне старых дрэў, закладванне шчылін у шматпавярховых дамах, няправільныя дзеянні пры знаходжанні кажана — усё гэта прыводзіць да гібелі жывёл.

Пры сустрэчы з начным звярком спецыяліст раіць не панікаваць, паколькі кажан баіцца вас больш, чым вы яго. Далейшыя дзеянні залежаць ад пары года. Улетку досыць шырока адчыніць вокны і дачакацца, пакуль жывёла сама пакіне памяшканне. Зімой жа на вуліцы мыш загіне, таму варта ўзяць кардонную скрынку, накрыць ёй жывёліну, знізу падсунуць ліст паперы, а пасля патэлефанаваць супрацоўнікам НПЦ па біярэсурсах.

— Ні ў якім разе нельга бегаць за кажаном са швабрай, кідаць у яго тапкі або выкідаць на вуліцу. Гэтыя дзеянні могуць нашкодзіць жывёліне, — адзначае эксперт. — Браць звярка на рукі можна толькі ў шчыльных пальчатках, паколькі, абараняючыся, ён можа ўкусіць. Але першым кажан ніколі не нападае.

Рукакрылыя, як і любыя млекакормячыя, з'яўляюцца пераносчыкамі шаленства. Аднак у адрозненне ад іншых жывёл у выпадку хваробы яны не бываюць агрэсіўныя. Выходзіць, што магчымасць падхапіць шаленства ад сабак і катоў значна вышэйшая, чым ад кажаноў.

— Кожную зіму мне тэлефануе каля 40 чалавек з просьбамі забраць кажана. І гэта пры ўмове, што не ўсе ведаюць, куды трэба звяртацца ў такой сітуацыі, — расказаў Аляксей Шпак. — Мы спадзяёмся, што «Кажанаполіс» вырашыць праблему. Прынамсі, мінчане будуць ведаць, як дзейнічаць, калі кажан заляціць да іх у дом.

У прыродзе кажаны засынаюць на зіму ў ціхіх цёмных месцах, дзе тэмпература складае да +8°С, такія ж умовы ім абяцаюць стварыць і куратары цэнтра. Для гэтага звяркоў, якія чамусьці прачнуліся зімой, будуць узважваць, адкормліваць да патрэбнай масы, а потым штучна ўводзіць у сон. З надыходам вясны іх выпусцяць у дзікую прыроду.

Для адкрыцця цэнтра актывістам трэба 2947 руб. Падтрымаць праект можна па спасылцы maesens.by/cause/tsentr-po-spaseniiu-letuchikh-myshei-kazhanapolis.

**Кацярына КІРЭЕВА**

■ «Зялёная» восень

# Два майстар-класы ў Мосары

## Рэдакцыя часопіса «Родная прырода» сустрэлася з юнымі чытачамі і рупліўцамі дэндрапарку

**Касцёл у знакамітай вёсцы Мосар на нейкі час ператварыўся ў навучальны клас: тут ладзілася сустрэча вучняў ДУА «Удзелаўскі дзіцячы сад — сярэдняя школа Глыбоцкага раёна» з журналістамі часопіса «Родная прырода».**

Месца сустрэчы выбрана невыпадкова, бо ў Мосары каля касцёла створаны цудоўны культурна-дэндралагічны комплекс, вядомы на ўсю краіну. Журналісты расказалі дзецям, як ствараецца часопіс. Зразумела, што найбольшую цікавасць школьнікі праявілі да дадатку «Юны натураліст».

Як высветлілася, на летніх вакацыях вучні актыўна збіралі макулатуру, пластык і здавалі іх на перапрацоўку. «Дзеці разам з настаўнікамі заўсёды ўдзельнічаюць у акцыях «Зробім!», — расказаў **галоўны спецыяліст Глыбоцкай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Артур ГАПАНЁНАК,** які таксама прыехаў на сустрэчу са школьнікамі. — Узімку дзеці клапоцяцца пра птушак. Таксама разам з настаўнікамі вучні займаюцца даследаваннямі прыроды».

Супрацоўнікі «Роднай прыроды» правялі майстар-клас і навучылі дзяцей рабіць экаручкі ды аплікацыі з макулатуры. Другую частку выязнога ўрока правёў Артур Гапанёнак, які прэзентаваў дзецям дакументальную стужку аб прыродных багаццях Віцебшчыны.

У гэты самы час на тэрыторыі дэндрапарку праходзіў яшчэ адзін майстар-клас. Ладзіў яго **старшы навуковы супрацоўнік Цэнтральнага батанічнага сада НАН Беларусі Міхаіл РУДЗЕВІЧ.** Некалі дэндрапарк стварыў ксёндз Юозас Булька разам з прыхаджанамі. З цягам часу дэндрапарк перайшоў на баланс аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Глыбоцкага райвыканкама. Але і для цяперашняга пробашча касцёла Святой Ганны Марата Казлоўскага, і для прыхаджан дэндрапарк застаецца месцам агульнага клопату. Цяжка ўявіць, што 20 гектараў тэрыторыі даглядае ўсяго восем чалавек: інжынеры па азеляненні і рабочыя. Між тым ксёндз Марат прасіў рэдакцыю часопіса дапамагчы арганізаваць сустрэчу персаналу парку з навукоўцамі, і журналісты запрасілі Міхаіла Рудзевіча. Спецыяліст раней быў у Мосары, таму ведаў, якія кансультацыі могуць спатрэбіцца.

«Тут працуюць дасведчаныя людзі, неабыякавыя да сваёй справы, — адзначыў навуковец. — Мне вельмі цікава гаварыць з імі, бо ідзе працэс узаемнага ўзбагачэння вопытам».

Акрамя кансультацый спецыялістаў, як нам падалося, дэндрапарку патрэбны і насенне кветак, і саджанцы. Зазначым, што кошт білета ў філіял Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музея і дэндрапарк складае 70 капеек для дарослых і 35 капеек для дзяцей. Як з гэтых капеек выдаткаваць грошы на набыццё кветак, цяжка ўявіць. Таму супрацоўнікі «Роднай прыроды» збіраюць прыгожую калекцыю пакецікаў насення, каб потым перадаць супрацоўнікам дэндрапарку.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

yanovskaya@zviazda.by

## Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 24 ноября 2017 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества, в рамках 220-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды объекта (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Характеристика имущества и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минская дистанция гражданских сооружений, тел.: +375 (17) 225-66-22, +375 (17) 225-22-25** | | | | | | | |
| 1 | Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Вокзальная, 11 | 10,2 | 3,0 | 38,76 | Под организацию розничной торговли продовольственной и непродовольственной группы товаров (кроме товаров, бывших в употреблении, и товаров ритуального назначения) | 3,80 | Помещение в здании вокзала станции Беларусь. Год постройки – 2002. Материал стен – панель, крыша – металлочерепица, полы – плитка, отопление – радиаторы металлические, водопровод – стальные трубы, канализация – чугунные трубы, электроснабжение – скрытая проводка, вентиляция – венткамеры, телефон – каблировн |
| 2 | | 17,9 | 3,0 | 68,02 | Под склад | 6,80 | |
| 3 | г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 14 | 70,9 | 3,0 | 269,42 | Под организацию розничной торговли продовольственной и непродовольственной группы товаров (кроме товаров, бывших в употреблении, и товаров ритуального назначения) | 26,90 | Помещение в здании вокзала станции Минск-Южный. Год постройки – 1961. Материал стен – кирпич, крыша – мягкая рулонная, полы – плитка, отопление – радиаторы металлические, водопровод – стальные трубы, канализация – чугунные трубы, электроснабжение – скрытая проводка |
| **Арендодатель – Государственное учреждение «Республиканский научно-практический центр психического здоровья», тел.: +375 (29) 304-80-50, +375 (17) 289-80-21, +375 (17) 289-80-48** | | | | | | | |
| 4 | г. Минск, Долгиновский тракт, 152 | 7,7 | 1,0 | 29,26 | Под административные цели (офис) | 2,90 | Помещение в административном корпусе. Имеются: электроснабжение, доступ к общему санузлу, общий вход. Отсутствуют естественное освещение и отопление. **Срок аренды – 3 года** |

**Договор аренды заключается сроком на пять лет, если иное не указано в настоящем извещении.**

**Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.**

Аукцион состоится **24 ноября 2017 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Возможность **осмотра имущества**, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель**.

**Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.**

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049, а также иными актами законодательства.

Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе:**

– уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением**!) по соответствующему предмету торгов (назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 220 от 24.11.2017 по предмету аукциона №** ______), перечисляемый на расчетный счет №BY34BPSB30121049710199330000 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, государственное предприятие «МГЦН» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов:**

– подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона):

***юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:***

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***индивидуальный предприниматель:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***физическое лицо*** – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

– заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:

физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;

представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** и консультации по вопросам участия в аукционе **осуществляются с 25 октября 2017 г. по 20 ноября 2017 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.**

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

– торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

– аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 100 (сто) базовых величин на дату проведения аукциона.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона**.

***Важно!*** *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

**Договора аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.**

**Телефоны для справок: отдел аукционов:** + 375 (17) 327 40 22; **отдел аренды:** + 375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57; **бухгалтерия:** + 375 (17) 328 36 58. **Интернет: www.mgcn.by**

## К СВЕДЕНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БелВитунифарм»

Внеочередное собрание акционеров состоится 10 ноября 2017 года в 12.00 по адресу: Витебский район, д. Должа, ул. Советская, д. 26А, актовый зал. Регистрация участников будет осуществляться по указанному выше адресу, для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность. Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 1 ноября 2017 г.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О создании филиала Общества.
2. О внесении изменений и дополнений в устав Общества.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 1 по 9 ноября 2017 г. (с 10.00 до 16.00) в кабинете начальника отдела правовой и кадровой работы.

Наблюдательный совет ОАО «БелВитунифарм». Тел. 8 0212 209390.

УНП 811001710

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ЗАО «ГОРИЗОНТ-БЕЛИНВЕСТ-ДЕВЕЛОПЕР», г. Минск, ул. Красная, д. 7, ком. 4 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | | | | |
| Изолированное помещение административного здания инженерного корпуса | Административное помещение | 29,5 кв. м | 100/D-79977 | г. Брест, ул. Московская, д. 204 |
| **Начальная цена с НДС 20% – 30 371,76 бел. руб.** | | | | |
| **Лот №2** | | | | |
| Изолированные помещения административного здания инженерного корпуса | Административные помещения | 247,6 кв. м 295,2 кв. м | 100/D-79978 100/D-79045 | г. Брест, ул. Московская, 204-1; 204-2 |
| **Начальная цена с НДС 20% – 420 000,00 бел. руб.** | | | | |
| **Лот №3** | | | | |
| Здание производственно-бытового корпуса | | 3 695 кв. м | 710/C-2712 | г. Бобруйск, ул. Минская, д. 170 |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,9864 га предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 296 654,40 бел. руб.** | | | | |
| **Лот №4** | | | | |
| Здание магазина продовольственных товаров с помещением для хранения продуктов питания | | 664,4 кв. м | 710/C-11693 | г. Бобруйск, ул. Урицкого, д. 27 |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,1101 га предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания магазина | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 480 297,60 бел. руб.** | | | | |
| **Лот №5** | | | | |
| Здание склада | | 104 кв. м | 710/C-13763 | г. Бобруйск, ул. Урицкого, д. 27А |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,0250 га предоставлен на праве аренды сроком по 01.01.2058 г. для содержания и обслуживания склада | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 26 133,84 бел. руб.** | | | | |
| **Лот №6** | | | | |
| Здание гостиницы | | 1 155,2 кв. м | 710/U-3619 | Могилевская обл., Бобруйский р-н, Сычковский с/с, около д. Сычково |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,2796 га предоставлен на праве аренды сроком по 25.04.2027 г. для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного здания гостиницы | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 228 376,80 бел. руб.** | | | | |
| **Лот №7** | | | | |
| Магазин бытовой техники (изолированное помещение с подвалом) | Торговое помещение | 427,2 кв. м | 320/D-13404 | Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, м-н 1-й, 1а-3а |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 355 514,40 бел. руб.** | | | | |
| **Лот №8** | | | | |
| Помещение магазина №20 | Помещение магазина №20 | 630 кв. м | 330/D-31849 | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, д. 80 |
| **Начальная цена с НДС 20% – 529 000,00 бел. руб.** | | | | |
| **Лот №9** | | | | |
| Помещение | Помещение, не относящееся к жилищному фонду | 695 кв. м | 340/D-21052 | Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Советская, д. 147, пом. 3 |
| **Начальная цена с НДС 20% – 501 487,20 бел. руб.** | | | | |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона |

**Лоты №4, №5, №7, №8 обременены договорами аренды.** Подробная информация на сайте организатора аукциона www.cpo.by

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **24.11.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **22.11.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by. Сайт: www.cpo.by |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.
**Продавец:** ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», 210002, г. Витебск, ул. М. Горького, 62, тел. (029) 896-47-55, (029) 714-50-17, alex-68.06@mail.ru.

| **Наименование объекта, начальная цена, задаток** |
|---|
| Лот №1. Капитальное строение с инв. №200/С-82204, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, д. 66, корп. 1, площадью 380,7 кв. м, наименование: здание компрессорной, назначение: здание специализированное энергетики, инв. №11018; дорога на промплощадке площадью 95 кв. м инв. №12007; забор кирпичный на кирпичных столбах протяженностью 140 м. п., высотой 3,3 м с воротами металлическими автомобильными дл. 6 м. инв. №12038; мостовой кран 5 т. инв. №142263-1. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым №240100000003004246 площадью 0,3481 га. Нач. цена: 78 940 руб. без НДС. Задаток: 7 894 руб. |
| Лот №2.Трансформатор силовой марки ТМЗ1000, инв. №141363, год выпуска – 1967. Нач. цена: 9 100 руб. без НДС. Задаток: 910 руб. |
| Лот №3. Трансформатор силовой марки ТМЗ1000, инв. №141364, год выпуска – 1967. Нач. цена: 9 100 руб. без НДС. Задаток: 910 руб. |
| Торги состоятся 24.11.2017 в 10.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: с 24.10.2017 с 8.30 по 23.11.2017 до 17.30. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5% от начальной цены лота. Условия: оплата НДС сверх цены продажи имущества, переоформление правоустанавливающих документов, в том числе на зем. участок, осуществляется за счет покупателя, обеспечение новым собственником имущества беспрепятственного въезда – выезда автотранспорта в интересах ОАО «ВКШТ» |

| **Наименование объекта, начальная цена, задаток** |
|---|
| Лот №1. Рапирный ткацкий станок фирмы «Dornier», тип PTS 4/J с накатным устройством NEUENHAUSER, электронной жаккардовой машиной тип SX фирмы «Staubli», дизайнерской программой и рамной конструкцией, инв. №145057, год выпуска 2012 г. Нач. цена: 60 480 руб. без НДС. Задаток: 6 048 руб. |
| Повторные торги состоятся 09.11.2017 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: с 24.10.2017 с 8.30 по 08.11.2017 до 17.30. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5% от начальной цены лота. Объект находится по адресу: г. Витебск, ул. М. Горького, 62. Условия: оплата НДС сверх цены продажи имущества, демонтаж оборудования осуществляется за счет покупателя. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 24.08.2017 г. |

**Задаток перечисляется на р/с: №BY70BLBB30120300082525001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской обл., BIC BLBBBY2X, УНН 300082525. Получатель платежа: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. №415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр.лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. **Победитель торгов (претендент на покупку) обязан:** в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Имущество, выставляемое на торги бывшее в употреблении. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

■ Дзеці на прымеце

# Першы зуб — першая чыстка

**Як толькі ў малога з'явілася некалькі зубоў, абавязкова пакажыце яго дзіцячаму стаматолагу, нават калі ўсё, на ваш погляд, у парадку.**



Урач павінен ацаніць зубную эмаль, даць парады па доглядзе зубоў, па харчаванні, асабліва па начным кармленні, што нярэдка прыводзіць да ранняга карыесу.

— Са з'яўленнем першага зуба павінны з'явіцца і першая паста, і першая шчотка, — заўважае **дзіцячы ўрач-стаматолаг 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Алена ВЫСОЦКАЯ.** — Для малочных зубоў і ротавай поласці да шасці гадоў рэкамендуецца толькі мяккая шчотка. Рабочая яе частка ў даўжыню не павінна перавышаць шырыню 2—3 зубоў. Для зусім маленькіх выпускаюць сіліконавыя шчоткі-напальчнікі — яны масіруюць дзясну, выдаляюць зубны налёт і прывучаюць да маніпуляцый у ротавай поласці. Пасля года малое ўжо спрабуе чысціць зубкі само, таму ручка шчоткі павінна быць зручная для дзіцячай кісці, не спакушайцеся на мадэлі, выкананыя ў форме цацкі...

❍ Перад першым выкарыстаннем вымыйце шчотку з мылам і абдайце кіпнем.

❍ Пасля выкарыстання шчотку зноў трэба мыць з мылам і захоўваць у вертыкальным становішчы без футляра, прызначанага толькі для транспарціроўкі.

❍ Колькасць пасты на шчотцы не павінна быць большая за пазногаць на мезенцы дзіцяці.

У выбары зубной пасты лепей прыслухацца да парады стаматолага. Паста павінна адпавядаць узросту. У 2—3 гады, калі дзіця яшчэ не ўмее як след паласкаць рот, паста павінна змяшчаць бяспечную пры выпадковым глытанні колькасць дабавак. Для 4-гадовых падыдзе паста з 500 ppm фтору. Сучасныя пасты, як правіла, не змяшчаюць цукру. Яго замяняе ксіліт, які папярэджвае развіццё мікраарганізмаў і выкарыстоўваецца для прафілактыкі карыесу. Пазбягайце пастаў з фарбавальнікамі.

Малыя эфектыўней навучаюцца, калі пераймаюць прыклад, паспрабуйце абыграць сітуацыю. Бацькоўскі нагляд за чысткай зубоў павінен заставацца гадоў да 10. Ранні і правільны догляд малочных зубоў — аснова здаровых зубоў на ўсё жыццё. Ад наяўнасці ўсіх малочных і пры гэтым здаровых зубоў залежыць правільнае фарміраванне сківіцы. Ранняе іх выдаленне прыводзіць да развіцця няправільнага прыкусу, што ўплывае на развіццё маўлення.

# Усе мінусы хадункоў

**Працяглае хаджэнне ў хадунках можа прывесці да парушэння развіцця сухажылляў і звязак ступні. Ножкі падварочваюцца, дзіця становіцца на бакавую частку ступні і нагрузка размяркоўваецца нераўнамерна.**

— Няправільна развіваюцца і мышцы галёнкі і сцягна, што можа прывесці да дэфармацыі ножак «іксам» або «колам», — тлумачыць **загадчыца 1-га педыятрычнага аддзялення 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Галіна ЦІЖ.** — Частае знаходжанне дзіцяці ў такой канструкцыі можа змяніць і паходку — яна стане спружыністай або з апорай на наскі. Хадункі нефізіялагічныя, бо прымушаюць стаяць і хадзіць раней, чым трэба. Дзіця павінна прайсці ўсе стадыі ад поўзання да спробаў самастойна хадзіць. Хадункі асабліва проціпаказаны малым з тонусам мышцаў...

Для мамы хадункі — рэч выгадная, бо на нейкі час можна пакідаць дзіця без пільнай увагі і быць упэўненай, што яно не ўпадзе. Для дзіцяці гэта шкодна, бо затармožваюцца натуральныя працэсы станаўлення нервовай сістэмы. Адсутнічае стан бяспекі і раўнавагі, дзіця знаходзіцца ў зафіксаваным стане і не можа па ўласным жаданні стаць або сесці. Таксама гэта можа прывесці і да няправільнага развіцця вестыбулярнага апарату. Працяглае знаходжанне ў хадунках можа траўмаваць і палавыя органы: з-за слабых мышцаў дзіця вымушана працягла абапірацца і перыядычна правісаць, пераціскаючы сасуды прамежнасці. Аднак ёсць выключэнні. Хадункі могуць выкарыстоўвацца пры такіх захворваннях, як дзіцячы цэрэбральны параліч, слабасць мышцаў, калі будзе карысная любога кшталту стымуляцыя.

Матэрыялы падрыхтавала **Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ Самаабследаванне для жанчын

# ШТО ТАМ ЗА ВУЗЕЛЬЧЫК?

## Прычынай развіцця раку малочнай залозы часцей за ўсё з'яўляюцца гарманальныя змяненні

Падчас уступлення ў клімакс у арганізме адбываецца «гарманальны крызіс» — актыўная перабудова, калі яечнікі губляюць сваю актыўнасць, зніжаецца выпрацоўка прагестэрону і эстрагенаў. Моцна рэагуюць на гэта малочная залоза і эндаметрый.

Вядома, што вядучая роля ў развіцці раку малочнай залозы належыць эстрагенам. Лішак палавых гармонаў стварае спрыяльныя ўмовы для захворвання. Найменш актыўна гармоны эстрагены паводзяць сябе падчас цяжарнасці і пасля родаў, пакуль доўжыцца грудное кармленне. Даказана, што роды і працяглае, звыш аднаго года, груднoе кармленне зніжаюць рызыку развіцця раку малочнай залозы. Разам з тым аборты прыводзяць да гарманальнага «выбуху», што можа справакаваць развіццё пухлін. Што да ўжывання гарманальных кантрацэптываў, то лічыцца, што яны могуць зніжаць рызыку развіцця гэтага віду раку, але павялічваць рызыку развіцця раку палавых органаў і остэапарозу (але адзінага меркавання ў спецыялістаў тут пакуль няма). Схільнасць да развіцця раку малочнай залозы могуць абумовіць і неспрыяльнае ўздзеянне навакольнага асяроддзя, такое запаленчае захворванне як мастыт. Істотна ўзрастае рызыка захварэць і ў жанчын, чые маці або сёстры перанеслі рак малочнай залозы.

Дабраякасныя захворванні, напрыклад фіброзна-кістозная мастапатыя, самі па сабе да раку не прыводзяць, аднак ствараюць неспрыяльны фон. Вельмі важным будзе спыніць іх развіццё — не вагой: атлусценне можа прыводзіць да развіцця раку малочнай залозы і палавой сістэмы.

— Пры невялікіх пухлінах ніякіх асаблівых сімптомаў не ўзнікае, — расказвае **ўрач акушэр-гінеколаг 11-й гарадской паліклінікі Мінска Кацярына БАГРАЦОВА.** — Любы выяўлены вузельчык яшчэ не азначае злаякасной пухліны. Не варта самім выстаўляць сабе дыягназ. Пры любых змяненнях у самой залозе, на скуры, пры павелічэнні лімфатычных вузлоў неабходна паказацца ўрачу — гінеколагу, хірургу, анколагу або ўрачу агульнай практыкі, які накіруе да адпаведнага спецыяліста. А каб з'явіцца да яго як мага раней, неабходна рэгулярна, хоць бы раз на месяц, праводзіць самаабследаванне.

Пры выяўленні ў малочнай залозе пухліны неабходна выканаць рэнтгеналагічнае абследаванне малочнай залозы — мамаграфію. Ва ўзросце пасля 50 гадоў пры наступленні клімаксу штогадовая мамаграфія паказана ўсім жанчынам. Для пацыентак да 45 гадоў альтэрнатывай з'яўляецца ўльтрагукавое абследаванне. Так можна ўстанавіць, якая пухліна — дабраякасная ці злаякасная. Праводзіцца з той жа мэтай і біяпсія пухліны — забор маленькага кавалачка тонкай іголкай для даследавання пад мікраскопам. Аднак канчатковы адказ можна атрымаць толькі пасля выдалення пухліннага вузла.

Пры падазрэнні на рак або пацверджаным дыягназе выконваюцца і іншыя даследаванні (для выяўлення метастазаў у іншых органах): ультрагукавое даследаванне падпахавых лімфатычных вузлоў, рэнтген груднoй клеткі і ўльтрагук брушной поласці.

Галоўным у лячэнні з'яўляецца выдаленне пашкоджанага пухлінай органа. Любое іншае лячэнне дае часовы эфект. Аперацыі могуць быць розныя: выдаленне ўсёй малочнай залозы з тлушчавай клятчаткай і лімфавузламі падпахавай вобласці з таго ж боку; выдаленне ўчастка малочнай залозы з пухлінай і лімфавузламі падпахавай вобласці з таго ж боку з прамянёвай тэрапіяй на зоне аперацыі. Пры вялікіх памерах выдаляецца малочная залоза, грудныя мышцы, сасуды.

Пры адсутнасці метастазаў прызначаецца антыгарманальны прэпарат. Пры наяўнасці метастазаў у лімфавузлах абавязковае выкарыстанне прамянёвай і хіміятэрапіі. Пры выяўленні метастазаў у іншых органах абавязковае выкарыстанне хіміятэрапіі, якая павінна зменшыць памеры або поўнасцю іх вынішчыць.

■ Псіхалогія для ўсіх



# ВЫДАТНАЯ ФІГУРА!

## Многім жанчынам ніяк не ўдаецца пахудзець. Чаму так?

**Наша цела нельга аддзяляць ад псіхікі. Пакутуе душа — пакутуе і цела. Усё, што адбываецца ў нашым целе, непасрэдна залежыць ад таго, як мы ўзаемадзейнічаем са знешнім светам на псіхічным узроўні. Праблема лішняй вагі — не выключэнне. Калі мы здаровыя, але пры гэтым набралі лішнія кілаграмы і працягваем папраўляцца, значыць, нашай псіхіцы для нечага гэта трэба.**

— Існуюць дзве асноўныя прычыны ўтварэння і захавання лішняй вагі. Наша падсвядомасць хоча нас абараніць — стварае абалонку, якая ахоўвае нас ад магчымых балючых узаемадзеянняў са знешнім светам, — расказвае **псіхолаг Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Настасся ХНЫКАВА.** — Падобна цёплым абдымкам, матэрынскаму клопату гэта абалонка павінна нас абараніць ад цяжкасцяў у адаптацыі, схаваць ад рэзкай самакрытыкі і строгага выхавання, змякчыць боль ад немагчымасці любіць і атрымліваць любоў. Ад унутраных псіхалагічных праблем назапашваюцца горыч, пустэча, страх, трывога, якія мы і «заядаем». Такім чынам псіхіка імкнецца вылечыць нас ад дэпрэсіі, пачуцця віны і г. д.

### ❍ Эфектыўныя псіхалагічныя ўстаноўкі, якія дапамогуць дасягнуць жаданага выніку

**• Правільная матывацыя. Матывы да пахудзення могуць быць розныя — жаданне наладзіць асабістае жыццё, кар'ерны рост, магчымыя праблемы са здароўем з-за лішніх кілаграмаў і г. д.**

**• Вера ў поспех. Вера ў свае магчымасці і выбраны метад наблíжаюць перамогу.**

**• Толькі рэальныя і канкрэтныя мэты. Вызначыце, наколькі і за які час неабходна дасягнуць мэты.**

**• Пазітыўныя эмоцыі. Напоўніце жыццё задавальненнем, каб не шукаць яго ў ежы. Вядома, што фізічная нагрузка, спорт павышаюць узровень «гармону радасці» — серататаніну. Наведвайце канцэрты, выстаўкі, гуляйце, знайдзіце хобі.**

**• Прыемнае з карысным. Выбірайце дыету па душы, гатуйце смачныя стравы з карысных прадуктаў. Знайдзіце такі від фізічнай актыўнасці, які менавіта вам будзе цікавы.**

**• Пазітыўнае мысленне. Паўтарайце псіхалагічныя ўстаноўкі: «Я люблю сваё цела», «У мяне выдатная фігура», «Органы майго цела здаровыя і нармальна функцыянуюць». Усе ўстаноўкі павінны быць у цяперашнім часе і без часціцы «не».**

**• Знайдзіце кампанію. Змагацца з праблемай значна лягчэй не ў адзіночку.**

**• Не бойцеся прасіць дапамогі. Калі трэба, прасіце парады. Вы набываеце новы навык, раней жа вы не ўмелі худзець. А значыць, будзе не проста.**

■ Візіт да стаматолага

# Імплантацыя... не для ўсіх

**Устанавіць дэнтальныя імплантаты можна не ўсім. Прычынай таму, часцей за ўсё, з'яўляецца дэфіцыт касцявой тканкі. Курэнне і дрэнная гігіена ротавай поласці адносяцца да асноўных проціпаказанняў.**

У стаматалогіі сёння вылучаюць імплантацыю адна- і двухэтапную.

Двухэтапныя імплантаты — класічныя — найбольш распаўсюджаныя. Сам імплантат, які замяшчае корань зуба і размяшчаецца ў касцявую тканку, знешне падобны на вінт, мае складаную структуру і падбіраецца індывідуальна. Сучасныя дэнтальныя імплантаты вырабляюцца з высакаякаснага сплаву тытану, які валодае найбольш высокай біялагічнай сумяшчальнасцю з нашым арганізмам. **Знешняя частка імплантата — абатмент** — гэта тая частка, што знаходзіцца над дзяснoй, на яе мацуецца зубная каронка. Устаноўка абатмента ажыццяўляецца праз 4—6 месяцаў пасля ўстаноўкі ўнутрыкасцявой часткі або непасрэдна пасля ўжыўлення імплантата. **Зубная каронка** — бачная частка канструкцыі — штучны зуб, які фіксуецца на абатмент і выглядае як сапраўдны.

Аднаэтапныя імплантаты адрозніваюцца тым, што канструкцыя імплантат-абатмент ад самага пачатку адзіная, што дазваляе скараціць час лячэння. Нагрузка на імплантат каронкай адбываецца праз 3—5 дзён.

— Перавагай усіх методык імплантацыі з'яўляецца магчымасць замяніць дэфект зубнoга шэрагу без выкарыстання «суседніх» зубоў, няма неабходнасці іх «абпільваць» і выкарыстоўваць у якасці апоры пад мостападобны пратэз, — адзначае **загадчыца стаматалагічнага аддзялення 4-й гарадской клінічнай стаматалагічнай паліклінікі г. Мінска Алена ВЯЧЭРСКАЯ.** — Імплантацыя дапамагае пацыентам з поўнасцю беззубай сківіцай і дае магчымасць пратэзавання здымнымі або нездымнымі канструкцыямі. Ужыўленне ў касцявую тканку сківіцы імплантатаў папярэджвае страту косці там, дзе няма зуба, бо косць без адпаведнай нагрузкі пачынае хутка змяншацца.

Магчымасць правядзення дэнтальнай імплантацыі вызначае спецыяліст-стаматолаг пасля агляду ротавай поласці, праведзення рэнтгеналагічнага даследавання, атрымання вынікаў аналізаў.

Тэрмін службы імплантатаў розны — ад некалькіх гадоў да 10—25 у залежнасці ад стану здароўя, гігіены ротавай поласці, выканання рэкамендацый урача.

■ Практычнае радзімазнаўства

# МЛЫН-МУЗЕЙ

**У вёсцы Жодзішкі Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці нядаўна распачаў сваю работу дзеючы вадзяны млын-музей. Яго стварыў ураджэнец названага старажытнага паселішча, руплівы мінскі прадпрымальнік Францішак Жылка. Упершыню млын упамінаецца ў пісьмовых крыніцах у 1620 годзе. Доўгі час ім валодалі Жылкавы продкі. Потым млын прыйшоў у заняпад. У суверэннай Беларусі яго гаспадаром стаў дбайны іх нашчадак Францішак Баляслававіч. Ён прывёў млын у дзеючы стан. Аднавяскоўцы атрымалі магчымасць малоць зерне. А госці — атрымліваць задавальненне ад наведвання такога цікавага аб'екта і выхоўвацца на нацыянальнай спадчыне.**



Шмат хто гаворыць аб захаванні зробленага нашымі продкамі для будучых пакаленняў. Але ж іх словы разыходзяцца са справамі... У гэтым сэнсе Францішак Жылка вельмі вылучаецца: гаворыць ён мала, а робіць шмат. Вырашыў арганізаваць музей этнаграфічных помнікаў — і ажыццявіў задуманае. Музеем стаў не толькі сам вадзяны млын. Яго ўнутраныя памяшканні насычаны шматлікімі рарытэтнымі экспанатамі — сапраўднымі і дзеючымі. Яны яскрава апавядаюць аб жыцці і працы селяніна-хлебароба. Наведвальнікі ўбачаць саху, ручныя малатарні і веялкі, сярпы, ганчарны круг, дрэваапрацоўчыя прылады. Шырока прадстаўлена ткацтва. Нават можна паспрабаваць працы кудзелю, ткаць на кроснах.

Мінчанку Жанну Сароку падчас экскурсіі вельмі ўразіў цэп для абмалоту збажыны. Ёй здавалася, што заўжды існаваў нейкі камбайн — хоць і драўляны. А як смачна пахне жытні хлеб, выпечаны з мукі, якую змалолі жорны млына!..

Млын-музей будзе не толькі захоўваць спадчыну нашых продкаў. Яго экспанаты адначасова асвятляюць веліч сучаснасці. Пераканаўча паказваюць дасягненні беларускага народа ў XX стагоддзі і ў сучаснай суверэннай Беларусі — ад сахі, сярпа, цэпа — да трактара, камбайна, аўтамашыны. Нашы сучаснікі ўбачаць, што не было раней такой тэхнікі, такога становішча, як сёння.



Млын будзе натхняць розныя пакаленні на вялікія здзяйсненні для росквіту роднай Беларусі.

**Іван ЯРАШЭВІЧ**

■

Пантэон Айчыны

# АНДРЭЙ ПОЛАЦКІ

(? — 1399)

**«О, салавей, летняя птушка, вось бы табе, салавей, сваім спевам праславіць вялікага князя Дзмітрыя Іванавіча і брата яго, князя Уладзіміра Андрэевіча, і зямлі Літоўскай двух братоў Альгердавічаў, Андрэя і брата яго Дзмітрыя, ды Дзмітрыя Валынскага! Яны — сыны Літвы храбрыя, крэчаты ў ратны час і палкаводцы праслаўленыя, пад гукі труб іх спавівалі, над шлёмамі мілавалі, з канца капія яны ўскормлены, з вострага мяча ўспоены ў Літоўскай зямлі». Вось так узнёсла ўсхваляў герояў славутай Кулікоўскай бітвы невядомы, але высокапаэтычны аўтар «Задоншчыны». Не ведаў ён, што менавіта яго літаратурны талент і мастацкае слова абессмяроціць імёны герояў гэтай бітвы, у прыватнасці братоў Альгердавічаў — Андрэя Полацкага і Дзмітрыя Бранскага. Хто б цяпер ведаў нейкага ноўгарад-северскага князя Ігара, каб не «Слова аб паходзе Ігаравым»? Вось такая моц геніяльнага твора, калі рэальны праўобраз літаратурнага героя вырастае да сімвалічнага вобраза свайго часу і нават краіны, калі нагадаць караля Артура, рыцара Раланда, прынца Гамлета і нашага князя Ігара.**

Менавіта «Задоншчыне» Андрэй Полацкі абавязаны славай героя перамогі над чорным Мамаевым полчышчам. Высакародны, мужны віцязь — аналаг еўрапейскага рыцара. Як не захапляцца ім?! А жыццё гэтага віцязя было цяжкім і драматычным: бацькоўская нялаская, адыход з роднага дома, блуканне па чужых дварах, паўстанне супраць несправядлівасці, палон і гады ў няволі, зноў нявызначанае блуканне і слаўная смерць на полі бітвы на Ворскле. Як ні дзіўна, але гэта звычайны лёс многіх Альгердавічаў першага і другога пакалення. Толькі малалікасць дакументаў не дазваляе нам пазнаёміцца з іх драматычным жыццём — увіцць гэтую разматую мазаіку людскіх лёсаў з напалам шэкспіраўскіх пачуццяў.

Калі б Альгерд перадаў велікакняжацкі пасад Андрэю, свайму старэйшаму сыну, безумоўна, гісторыя ВКЛ пайшла б не Ягайлавым шляхам да Крэва і Кракава, а зусім іншым. Андрэй працягваў бы бацькоўскую палітыку збору ўсходнееўрапейскіх земляў і многае зрабіў бы. Хоць чаго гадаць. Сталася як сталася.

На той час, 1377 год смерці Альгерда, Андрэй ужо пабываў пскоўскім князем, але заставаўся князем полацкім. Менавіта з-за полацкага пасада ён у 1342 г. пакінуў Пскоў, прызначыўшы там сваіх намеснікаў. Не паслухаўся просьбаў пскавічоў правіць у Пскове самаму, таму знайшлі яму замену ў 1348 г. Андрэй быў першым памочнікам у бацькоўскіх справах, і, вядома, Альгерд хацеў мець у Полацку менавіта яго. У 1358 г. Андрэй заваладаў такім важным для ВКЛ горадам, як Ржэў. Хадзіў з бацькам у паходы на Маскву, яшчэ не прадбачачы, якую ролю адыграе яна ў яго ным жыцці. Абараняў Полаччыну ад крыжакоў, калі яны ў 1366 г. прыйшлі пад Полацк. Сам хадзіў у паходы на Лівонію, помсцячы крыжакам за спусташэнне роднага краю. З усіх Альгердавічаў ён быў варты велікакняжацкага пасада, але Альгерд з-за сваіх бацькаўскіх пачуццяў завяшчаў яго старэйшаму сыну ад другой сваёй жонкі Ульяны Цвярской, Ягайлу. Пэўна, думаў, што ён паклапоціцца аб сваіх малодшых братах. Андрэй не прызнаў Ягайлу вялікім князем і выехаў у Пскоў шукаць дапамогі. Пэўна, спадзяваўся, што яго зноў абяруць пскоўскім князем. Але пскавічы не хацелі ўвязвацца ў міжусобную вайну паміж Альгердавічамі. Тым часам Полацк абклала насланае Ягайлам войска на чале з усюдыісным Скіргайлам. Андрэй адправіўся да таго, хто мог дапамагчы яму, — маскоўскага князя Дзмітрыя Іванавіча. Той дапамог, але сабе на карысць. Пайшоў паходам да Бранска, дзе яго хлебам-соллю сустрэў князь Дзмітрый Альгердавіч, перадаўшы свае ўладанні — Бранск, Трубчэўск і Старадуб пад яго ўладу. Гэта аслабіла ВКЛ, але не ўзмацніла самога Андрэя. Давялося ўтаймоўваць сваю ганарыстасць і служыць маскоўскаму князю. У 1378 г. у бітве з татарскім полчышчам Беліча, першай выйграна́й маскавітамі ў татар бітве, ён унёс важкі ўклад у перамогу. «Ударылі па іх з аднаго боку князь Андрэй Полацкі, а з другога боку Даніла Пронскі», — паведамляе летапіс. А пасля будзе славутая перамога 8 верасня 1380 г. на Куліковым полі, дзе Андрэй Полацкі ўзначаліў полк правай рукі. Напярэдадні бітвы ён параіў Дзмітрыю Івана-вічу перайсці Дон: «Калі будзем тут, слабым будзе воінства, калі ж мы на другі бок Дона пяройдзем, моцнымі і мужнымі будзем». Словы, у якіх праявілася Андрэева натура — моцная і мужная. Ён не даваў воінству магчымасці адступіць у цяжкі час: загінуць або перамагчы — іншага ён не бачыў. Перамога была аплачана вялікімі стратамі. Дзмітрый Данскі не тое, што не мог дзейна дапамагчы Андрэю, але ў 1382 г. даць належны адпор нашэсцю залатаардынскага хана Тахтамыша, і пакінуў абараняць сваю сталіцу князю Асцею, якога лічаць за Андрэева сына. Але прыход у 1381 г. да ўлады ў ВКЛ Кейстута дазволіў Андрэю вярнуцца ў Полацк. Палачане выгналі з горада Скіргайлу. Цяпер Андрэй больш рэалістычна ацаніў свае сілы і магчымасці, ён ужо не прэтэндуе на велікакняжацкую ўладу ва ўсім Вялікім Княстве, ён хоча кіраваць Полацкай зямлёй як сваёй дзяржавай, называе сябе вялікім князем Полацкім (для лівонцаў ён «рускі кароль Полацка»), б'е сваю манету. Аднак лёс зноў супраць яго. Падманам і з дапамогай крыжакоў да велікакняжацкай улады прыйшоў зрынуты Ягайла. Пасля смерці Кейстута чарга падышла і да Андрэя, які абвясціў сябе самастойным гаспадаром. Страта Полацка — гэта страта Дзвінскага гандлёвага шляху. Гэта эканамічны ўдар па ВКЛ. Не чакаючы драматычнай развязкі, Андрэй едзе ў Пскоў і ўжо там у доўгіх роздумах вырашае звярнуцца па дапамогу да Ордэна. Пайсці шляхам Вітаўта, які з крыжакамі ваяваў з Ягайлам. 9 кастрычніка 1385 г. Андрэй аддае сваё «Полацкае каралеўства» пад уладу Лівонскага ордэна. Такі вось гістарычны паварот, які вызначыў для Полацка ганарысты яго князь. Магчыма, саюз з ордэнам ён лічыў часовай мерай, хацеў падмануць крыжакоў, як Вітаўт. У 1386 г., калі Ягайла з братамі адпраўляўся ў Польшчу каранавацца, Андрэй падняў паўстанне (хоць гэта гучна сказана). Дапамога лівонскіх крыжакоў вылілася ў рабаванне земляў ад Лукомля да Ашмян. Невядома, ці прыняў Полацк былога свайго князя, які апроч турбот і вайны нічога станоўчага не мог даць гораду. Прынамсі, абараняўся Андрэй ад войскаў Скіргайлы і Вітаўта ў Лукомлі. Пэўна, як Кейстут у свой час, Андрэй паверыў хітрым словам Скіргайлы і здаўся. Шэсць гадоў правёў Андрэй у зняволенні ў Хэнцінскім замку і мог там і згінуць. У 1394 г. за яго паручыліся Вітаўт, Скіргайла, кіеўскі князь Уладзімір Альгердавіч і кобрынскі князь Фёдар Альгердавіч. Ягайла даў яму свабоду, каб ён памёр ціха і непрыкметна. Састарэлы князь ужо не мог знайсці сабе месца ў жыцці. Ён называе сябе вялікім князем, але ў яго не было нават удзела. Яго прытуліў за былыя заслугі Пскоў, дзе быў намеснікам ягоны сын Іван Андрэевіч. Загінуў у бітве з Алегам Разанскім сын Міхаіл, а Асцей (Аляксандр) трапіў да яго ў палон, памёр Сямён. Вось так загінулі мары аб велічы і годнасці, страчаны родны дом і зямля; ён, вялікі князь без княства, жыве на сынаву ласку. Жыццё без мары, без мэты, без справы, роўна як бясп раўнае жыццё, — яно было не для Андрэя. Вялікі князь Андрэй Полацкі загінуў 12 верасня 1399 г. у бітве з залатаардынскім войскам на Ворскле, паклаўшы сваю душу за «другі свае».



**Віталь ЧАРОПКА.**

■ З нагоды

# «ЁН ЗМАГАЎСЯ ЗА ІДЭАЛЫ»

## Пра ролю Тадэвуша Касцюшкі ў станаўленні нашай дзяржаўнасці

**200 гадоў таму не стала Тадэвуша Касцюшкі — выдатнага сына беларускай зямлі. У Злучаных Штатах Амерыкі ён з'яўляецца нацыянальным героем, бо шмат зрабіў для станаўлення незалежнасці гэтай краіны. Да станаўлення беларускай дзяржаўнасці Тадэвуш Касцюшка таксама прычыніўся. Пра гэта карэспандэнт «Звязды» пагутарыла з загадчыкам аддзела гісторыі Беларусі Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдатам гістарычных навук Андрэем УНУЧКАМ.**



***— Раскажыце, якую ролю Тадэвуш Касцюшка адыграў у гісторыі беларускага народа?***

— Ён змагаўся за тыя ідэалы, якія цяпер шануюцца ва ўсім свеце, — свабоду і незалежнасць краіны. Ён змагаўся за гэту зямлю, рызыкаваў дзеля яе жыццём і праліваў кроў. У канцы XVIII стагоддзя Рэч Паспалітая абодвух народаў, куды ўваходзіла Вялікае Княства Літоўскае, была пад вялікай пагрозай. Гэту дзяржаву дзялілі тры вялікія манархіі — Расійская імперыя, Аўстрыйская імперыя і Прускае каралеўства. Фактычна для кожнага патрыёта гэта было абразай нацыянальнага гонару, вялікай ганьбай. Тадэвуш Касцюшка, як сын сваёй краіны, не мог глядзець абыякава на такое становішча. Ён быў вайскоўцам і шляхціцам. А дэвіз нашай шляхты: «Бог. Гонар. Айчына». Таму натуральна, што ён узначаліў паўстанне, як аўтарытэтны чалавек і як прафесійны вайсковец. Змаганне не мела поспеху, але разам з тым яно дало надзею, што ў будучыні дзяржаўнасць на нашых землях будзе адроджана.

***— Можна сказаць, што перадумовы сучаснай беларускай дзяржаўнасці склаліся ўжо ў той час?***

— Сітуацыя была такая, што ў 1773 годзе склікалі сойм Рэчы Паспалітай, на якім дзяржавы, што дзялілі гэты край, хацелі, каб дэпутаты самі прагаласавалі за падзел. Праз 20 гадоў зноў быў праведзены «маўклівы сойм» у Гродне, на якім таксама імкнуліся да таго, каб шляхта згадзілася з падзелам сваёй краіны. Мэтай было не проста знішчыць дзяржаву, а паказаць, нібы нашы продкі самі хацелі, каб яна знікла. Паўстанне вырашыла гэта пытанне канчаткова: калі людзі аддавалі свае жыцці за краіну, значыць, падзелы былі не добраахвотнымі, а гвалтоўнымі і несправядлівымі. А як сказаў Аўраам Лінкальн: «Ніводнае справа не вырашана канчаткова, пакуль яна не вырашана справядліва». Пытанне паўстання было вельмі вострым, яно гучала і ў Расіі, і ў Прусіі, і ў Аўстрыі. Таму з распадам Расійскай і Германскай імперый дзяржаўнасць у гэтым рэгіёне, у тым ліку ў Беларусі, была адноўлена.

***— Чаму менавіта Касцюшка апынуўся на чале змагання?***

— Яго выбралі, бо ён быў гарачым патрыётам. На момант падрыхтоўкі паўстання ў некалькіх бітвах ён праявіў сябе вельмі добра. Істотным быў яго высокі вайсковы прафесіяналізм: дзве бітвы, якія ён выйграў у вайне за незалежнасць Злучаных Штатаў Амерыкі, зрабілі яму славу вайскоўца міжнароднага маштабу. Бо перамагчы войска Вялікабрытаніі — у тагачасным свеце гэта было надзвычайна. Да таго ж Касцюшка быў земляком караля і вялікага князя Рэчы Паспалітай. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі таксама паходзіў з нашай Берасцейшчыны. У паўстанцаў было пытанне: «А на чыім баку будзе кароль?» Гэта быў вельмі істотны момант.

***— Шмат у нас было добрых палкаводцаў. Аднак менавіта Касцюшка стаў героем фальклору, яму прысвячалі песні. Чаму простыя людзі так ганаравалі яго славай?***

— У кожнай эпохі ёсць знакавая фігура. І менавіта такім быў Тадэвуш. Накануне напярэдадні паўстання 1863 года ў «Мужыцкай праўдзе» друкаваліся згадкі пра яго як пра героя. Асоба Касцюшкі была блізкай да ідэалу канца XVIII — пачатку XIX стагоддзя. Таму што тады фарміраваліся нацыі. Паступова адыходзіў у нябыт саслоўны падзел і фарміравалася нацыянальнае грамадства. Раней «народам» называлася толькі шляхта. Аднак на Захадзе адбывалася набліжэнне «простага люду» праз тое, што ўсе грамадзяне краіны набывалі нацыянальную свядомасць, а значыць, бралі і неслі адказнасць за сваю дзяржаву і народ. Касцюшка насіў шэрую вопратку касінера — ён з'яўляўся носьбітам новага светапогляду, ён не быў палкаводцам старога манархічнага ладу. Ён стаў правадыром народа. Для беларусаў ён застаўся мясцовым, сваім, — належаў да нашай шляхты.

***— Ці ўшаноўвалася асоба гэтага героя ў наш час?***

— Так, яму былі прысвечаны не толькі фальклорныя творы. У 1994 годзе была выдадзена марка ў гонар паўстання і самога Тадэвуша Касцюшкі. Імем Касцюшкі названы вуліцы ў Гродне, Брэсце, Косаве, Лідзе; у Гродне і Косаве ўстаноўлены мемарыяльныя знакі ў яго гонар. У 2003 годзе па ўзроўні Брэсцкага аблвыканкама было прынята рашэнне аднавіць сядзібу ў Мерачоўшчыне, стварыць музей. Мы можам казаць пра два дакументальныя фільмы ў гонар гэтай асобы. Адзін з іх, чатырохсерыйны «Тадэвуш Касцюшка. Вяртанне героя», быў паказаны на Першым нацыянальным тэлеканале ў 2007 годзе. Другі фільм «Вобраз героя. Тадэвуш Касцюшка» быў зроблены «Белвідэацэнтрам» адмыслова да яго 265-годдзя ў 2001 годзе. Такім чынам, памяць пра гэту постаць у нас не перапынялася.

***— Ці важна ў сучасным грамадстве падтрымліваць памяць пра Касцюшку?***

— Натуральна, бо кожнае пакаленне стаіць перад сваімі выклікамі. Сёння мы кажам пра сваю незалежнасць, пра наша месца ў свеце, таму прыклад Касцюшкі для нас вельмі важны. Аднак ёсць і знешнія прычыны. Многія краіны трацяць вялікія сродкі, каб выбудаваць адносіны з Амерыкай. А мы маем такога героя, які ў гісторыі гэтай краіны адыграў вельмі важную ролю. Помнік яму ёсць у Ваеннай акадэміі ў Вест-Пойнце, вялікая статуя стаіць у Чыкага, у Філадэльфіі створаны музей Тадэвуша Касцюшкі. Наш зямляк уваходзіць у шэраг герояў Амерыкі, і гэта вялікі рэсурс для нашай краіны. Тое ж можна казаць пра Польшчу, Літву, у якіх таксама вельмі шануецца памяць пра яго. Але яшчэ больш важна гаварыць пра нашу ўнутраную сітуацыю. Гісторыя жыцця Касцюшкі паказвае, што наша дзяржаўнасць грунтуецца не на пустым месцы. Яна не ўзнікла выпадкова. Кожны, хто недаацэньвае нашу незалежнасць, павінен ведаць гісторыю, што нашы продкі ўжо 220 гадоў таму за яе змагаліся. Гэта важна для патрыятычнага выхавання.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ Сваімі словамі



# Час за ці супраць нас?..

**Гэтымі днямі даводзілася назіраць за сітуацыяй, якая разварочвалася вакол усталявання помніка Тадэвушу Касцюшку ў Швейцарыі — у горадзе Залатурне, дзе ён пахаваны. Камянём спатыкнення стала шыльда каля скульптуры, а дакладней яе змест. Пытанне паўстала такое: ці маюць беларусы права напісаць, што яны паставілі помнік свайму суайчынніку?.. Некаторыя меркавалі, што не.**

Помнік быў зроблены на сродкі Асацыяцыі беларусаў Швейцарыі. Заканамерна, што на шыльдзе яны хацелі напісаць: «Выдатнаму сыну Беларусі ад удзячных суайчыннікаў». Аднак у апошні момант, калі помнік ужо быў гатовы і дастаўлены ў Швейцарыю, нечакана ўмяшаўся трэці бок. Польскі пасол у Берне запатрабаваў змяніць шыльду. Ён заявіў, што калі будзе зацверджаны першапачатковы надпіс, то афіцыйная дэлегацыя іх краіны не будзе ўдзельнічаць у швейцарска-польскіх мерапрыемствах, прымеркаваных да 200-годдзя смерці Касцюшкі, у Залатурне... У выніку мэр горада пагадзіўся з такімі патрабаваннямі. Шыльду вырашылі замяніць, адтуль цалкам прыбралі надпіс на беларускай мове, а тое, што засталося, гучала так: «Пастаўлены Асацыяцыяй беларусаў Швейцарыі ў 2017 годзе». Словы «беларусаў» прапаноўвалі напісаць як Weissrussischen. Прытым што ў першапачатковым варыянце, на замежнай мове яно было напісана як Belarus. Пагадзіцеся, розніца істотная.



**Намеснік старшыні Асацыяцыі беларусаў Швейцарыі Алесь САПЕГА з помнікам Тадэвушу Касцюшку ў Залатурне.**

У справу давялося ўмяшацца Міністэрству замежных спраў Беларусі. З мэрам Залатурна асабіста сустракаўся кіраўнік беларускай дыпламатычнай місіі ў Швейцарыі Павел Мацукевіч. Менавіта яму ўдалося дамовіцца з мэрам наконт прыняцца кампрамісу. Канчатковы варыянт шыльды выглядае так «Тадэвуш Касцюшка. 1746—1817. Ад Беларускага аб'яднання ў Швейцарыі. 2017 год», на беларускай і нямецкай мовах. 21 кастрычніка помнік з такой шыльдай нарэшце быў адкрыты.

Шчыра сказаць, не надта прыемная гэта гісторыя. І не вельмі хочацца гаварыць пра яе са старонак рэспубліканскага выдання. Але ж факты застаюцца фактамі. Тое, што адбылося ў Залатурне, — як лакмусавая паперка. Кожны можа зрабіць уласныя высновы — і нават не трэба нічога тлумачыць.

А мне вось думаецца пра саміх беларусаў і пра нашу славутую талерантнасць. Часам ужо надараецца чуць, што гэта якасць у нашага народа — быццам фэйкавая... Але ж відавочна, што нават уявіць, каб Беларусь умешвалася ў культурныя справы іншай краіны на тэрыторыі трэцяй дзяржавы, проста немагчыма. Гэта здаецца зусім нерэальным. Ёсць у нас пачуццё ўласнай годнасці і разуменне мяжы, за якую не варта пераходзіць. Усім вядомая ісціна пра тое, што свабода аднаго чалавека (чытай, народа) заканчваецца там, дзе пачынаецца свабода другога... І я радуюся, што ў нашым менталітэце не закладзена імкненне высвятляць адносіны, спробы паказаць іншым іх месца. У нас ёсць сваё месца, а чужога не трэба. Усіх сяброў (і нават не сяброў) шчыра паважаем. Добра, што ёсць у гэтым свеце, у цэнтры Еўропы, такая краіна-міратворац.

Гэта станоўчая якасць, вядома ж, часам выходзіць нам крыху бокам. Мы настолькі талерантныя, што, здараецца, не ўмеем адстойваць сваё. З гэтай боязі — хоць бы не пакрыўдзіць каго — часам гатовы ўласнае аддаць: «Вазьміце, забірайце, толькі не крыўдзіцеся». У гэтым сэнсе сітуацыя з шыльдай, калі былі адстаяны кампрамісны варыянт, з захаваннем беларускай мовы, выглядае нават пазітыўна — у нас не кожны раз так адбываецца.

Хоць і гэта заканамерна. Беларусь заўсёды была скрыжаваннем, дзе сутыкаліся розныя імперыі, пастаянна вяліся баявыя дзеянні. Кватаравaліся захопнікі розных масцяў: і што ты зробіш, і каму дакажаш?.. Чакалі лепшых часоў — а можа, усё зменіцца раптам? Але, часы, відаць, і не плануюць рабіць саступкі беларусам. Бо і сёння нам даводзіцца змагацца за права ўсталяваць помнік, зроблены на ўласныя грошы, з надпісам на роднай мове.

